

ІМУНІТЭТ У ТАЛЕРЦЫ

7

САКРЭТЫ ШЧАСЦЯ АЛЕНЫ СПІРЫДОВІЧ

8



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 ВЕРАСНЯ 2023 г. СУБОТА № 190 (30070)

З першых вуснаў

# «КАБ БЫЎ МІР, НАМ ТРЭБА ЎКАЛЫВАЦЬ, УКАЛЫВАЦЬ І ЎКАЛЫВАЦЬ»

## Падрабязнасці рабочай паездкі кіраўніка дзяржавы ў Магілёўскую вобласць

**Наведваючы Бялыніцкі раён, Аляксандр Лукашэнка асабіста праверыў, як выконваюцца яго даручэнні па комплексным рамонце дарог у перспектыўных сельскіх населеных пунктах, па развіцці жывёлагадоўлі і нарошчванні вытворчасці каштоўных парод рыб. Акрамя таго, ішла размова аб эканамічных паказчыках рэгіёна. Прэзідэнт звярнуў увагу і на праблемныя пытанні вобласці.**

### «Галоўнае — гэта аграгарадкі»

Падчас наведвання аграгарадка Вішоў Бялыніцкага раёна Прэзідэнту паказалі, як будзе выглядаць вёска будучыні. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы нагадаў пра добрую практыку савецкіх часоў — адрасы передавога вопыту. Аграгарадок Вішоў — адзін з такіх адрасоў.

Менавіта добраўпарадкаванне аграгарадкоў стала тэмай рабочай паездкі беларускага лідара — «практычных заняткаў», як ён сам заўважыў. У Беларусі такіх населеных пунктаў — 1417. «Што ўтойваць, насельніцтва сельскае ў будучыні будзе жыць у аграгарадках, працэнтаў на 80—85, — сказаў Прэзідэнт. — Астатняе насельніцтва — у буйных вёсках». Па яго словах, магчыма, будуць развівацца і некаторыя неперспектыўныя вёскі. Аднак пры ўмове, што да іх праявяць цікавасць прыватныя асобы.

СТАР. 2



Фота БелТА.

# ПАШАНА ЗАЛАТОМУ ЎЗРОСТУ

Дарагія сябры!

Сардэчна віншую вас з Днём пажылых людзей.

У Год міру і стваральнай працы з асаблівай удзячнасцю аддаём даніну павагі ўсім вам. Тым, хто, не шкадуючы сіл, працаваў, каб у нашай любімай Беларусі запанавалі адзінства, узаемная падтрымка і грамадская згода. Бо многае з таго, чым сёння па праве ганарыцца наш народ, што складае аснову яго сучаснага эканамічнага і культурнага патэнцыялу, — вынік менавіта вашай шматгадовай самаадданай работы.

Людзі залатога ўзросту і сёння з'яўляюцца актыўнымі грамадзянамі, працягваюць, выкарыстоўваючы свае веды і досвед, уносіць вялізны ўклад у развіццё грамадства.

Гледзячы на вас, моладзь стараецца кіравацца гэтым цудоўным прыкладам — шчыра любіць родную зямлю і рабіць усё магчымае на карысць сваёй краіны.

Хачу запэўніць, што беларуская дзяржава працягне прытрымлівацца такой сацыяльнай палітыкі, якая дапамагае акружыць кожнага з вас клопатам і ўвагай, стварыць найлепшыя ўмовы для дастойнага жыцця.

У гэты святочны дзень я ад усёй душы жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту.

Няхай вашы блізкія людзі, дзеці і ўнукі радуюць сваімі поспехамі і перамогамі як мага часцей.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота БелТА.

**Мар'яну СКРАМБЛЕВІЧУ з аграгарадка Адэльск Гродзенскага раёна ўжо за восемдзесят. Але ён працягвае займацца сваёй любімай справай — майстраваць народныя інструменты з дрэва, якіх ён за жыццё зрабіў сотні. За адраджэнне традыцый народнага рамяства Мар'ян Антонавіч уганараваны прэміяй «За духоўнае адраджэнне», а нядаўна стаў кавалерам медаля Францыска Скарыны.**

# УСЕ МЫ — ВАШЫ ВУЧНІ

*Педагагічным работнікам Рэспублікі Беларусь*

Паважаныя работнікі сферы адукацыі!

Дарагія сябры!

Віншую вас з Днём настаўніка — самым душэўным і блізкім усім нам святам! Бо кожны дарослы калісьці быў вучнем, а многія паглыблены ў школьнае жыццё сваіх дзяцей і ўнукаў.

Мы шчыра дзякуем педагогам і выхавальнікам за адданасць справе, любоў да дзяцей, прыклад мудрага стаўлення да жыцця.

У вашых руках будучыня Беларусі. Прывіваючы ў моладзі любоў да ведаў, выхоўваючы павагу да спрадвечных каштоўнасцяў, фарміруючы беражлівае стаўленне да гісторыі роднай зямлі і гонар за дасягненні краіны, вы ствараеце і ўмацоўваеце асновы дзяржаўнасці.

Я звяртаюся да маладых спецыялістаў, якія сёння з гордасцю прымяраюць на сябе высокае званне «настаўнік». Перакананы, абапіраючыся на вопыт старэйшых настаўнікаў, захоўваючы пераемнасць традыцый нацыянальнай школы, вы зробіце ўсё, каб павысіць імідж айчыннай адукацыі, якая заслужана прызнаецца адной з найлепшых у свеце.

Жадаю вам творчага натхнення, моцнага здароўя і новых дасягненняў на карысць падрастаючага пакалення і любімай Беларусі!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**З Днём настаўніка вучні 8 «А» кадэцкага класа сталічнай сярэдняй школы № 152 імя С. С. Бельчанкі віншуюць выкладчыцу матэматыкі Аксану МАЗАНІК. Педагагічны стаж у Аксаны Мікалаеўны больш за 30 гадоў, з іх 28 яна працуе ў гэтай школе.**

ISSN 1990 — 763X

23190

# «КАБ БЫЎ МІР, НАМ ТРЭБА ЎКАЛЫВАЦЬ, УКАЛЫВАЦЬ І ЎКАЛЫВАЦЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Але галоўнае — гэта аграгарадкі, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Мы пішам там рознага роду кандыдацкія, доктарскія, дысертацыі — сорамна назву чытаць, не тое што глядзець на гэтую дысертацыю. Давайце на гэтыя тэмы будзем нешта пісаць, распрацоўваць. Тым больш спецыялістаў у нас дастаткова, якія добра ведаюць, як было, як ёсць і як будзе — гэта значыць, цэлы пласт можна і трэба падняць для разважання і ўжо практыкі». Прэзідэнт перакананы: для таго, каб людзі заставаліся ў сельскай мясцовасці, варта ствараць адпаведныя ўмовы.

Па традыцыі, наведваючы рэгіёны, кіраўнік дзяржавы звяртае ўвагу на ход сельскагаспадарчых работ. Магілёўшчына не стала выключэннем. «Не магу сказаць, што не працуеш, — звярнуўся ён да старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоля Ісачанкі. — Работы ідуць. Але баюся, што ты спазняешся. Проста расслабіла нас надвор'е, а яно на наступным тыдні пачне пагаршацца. Трэба паскарацца — як мінімум у два разы».

Па словах Прэзідэнта, найважнейшыя пытанні пры рабоце на зямлі на бягучы момант — уборка кукурузы і сяўба азімых. Акрамя таго, даручана добраўпарадкоўваць і абводненыя землі. Пастаўлена задача — узмацняць работу па меліярацыі, навёрстваць тое, што было ўпушчана раней.

## «Якасць — найважнейшае пытанне»

У аграгарадку Вішоў Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з рэалізацыяй пілотнага праекта па рамонце вулічна-дарожнай сеткі ў перспектыўных сельскіх населеных пунктах, у тым ліку з прымяненнем цэменту. Прэзідэнту далажылі і аб тэмпах рамонтных работ на дарогах у цэлым па краіне.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, наколькі выканана яго даручэнне — прывесці ў парадак дарогі — і ці паспяваюць гэта зрабіць. Вярнуўшыся да дарожнага пытання ў сельскай мясцовасці, беларускі лідар адзначыў, што варта паглядзець на законнасць дзеяння кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў на зямельных угоддзях. «Абсалютна перакананы (ёсць падазрэнні сур'ёзныя), што яны як будавалі ў свой час, так і будуюць новую вуліцу ў полі, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Не павінен быць адвод зямельных угоддзяў. Гэта толькі са згоды Прэзідэнта. Сумняваюся, што тое, што я бачыў, усё ўзгадняў. Трэба паглядзець сур'ёзна, правесці рэвізію выкарыстання зямельных угоддзяў. Вуліца на 20 хат вымерла — з'ехалі людзі. Мы лезем на новыя ўчасткі, пачынаем там будаваць хаты. Давайце на гэтых участках (40—50 сотак) пабудуем дом або аддадзім чалавеку — няхай будуе, і будзем аднаўляць, рэанімаваць гэтую вуліцу, няхай яна жыве. Яна ўжо намоленая, мае сваю інфраструктуру: нейкая дарога, электрычнасць, газ... Навошта лезці ў поле? Гэта ж дзікія выдаткі. Трэба вывучыць гэтую тэму».

Як далажыў старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Васіль Герасімаў, па ўсёй краіне праведзена рэвізія самавольна занятых участкаў. За гэта, па словах кіраўніка дзяржавы, трэба адказваць. Як і за якасць дарог. «Нельга рабіць дрэнна, — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт. — Квадратныя метры — добра, але якасць — найважнейшае пытанне. Трэба нам будучы год аб'явіць Годам якасці. Усё ў нас добра: і аб'ёмы робім, і попыт на беларускае каласальны. Мы не паспяваем забяспечыць попыт Расіі. За плотам завёз — прадаў. Грошы ў нас ёсць газ, нафту купіць і гэтак далей. Але ў нас яшчэ ёсць праблемы з якасцю. Таму якасць і яшчэ раз якасць. І за гэта адказваць трэба!»

Прэзідэнт яшчэ раз паўтарыў: «Рыхтуйцеся да таго, што наступны год — гэта Год якасці. І на зямлі, і ў жывёлагадоўлі, і ў прамысловасці, і ў сельскай гаспадарцы, і ў абслугоўванні, і ў дарогах». Што датычыцца якасных дарог, кіраўнік дзяржавы нагадаў добра вядомае — той, хто любіць катацца, павінен і санкі вазіць. А то на сям'ю — па дзве-тры машыны, а падатак на дарогі, якi зусім не вялікі, заплаціць шкадуюць. «Мы ўзмоцнена імкнёмся падтрымліваць якасць гэтых дарог, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Наш лёс такі, дзяржавы, звяртаць на гэта ўвагу і рамантаваць гэтыя дарогі, але рамантаваць трэба якасна — людзі гэта ўбачаць. Няякасна рабіць нельга. Якасць і яшчэ раз якасць».

На прыкладзе перспектыўнага населенага пункта Прэзідэнту паказалі розныя тэхналогіі рамонту вулічна-дарожнай сеткі. Кіраўніку дзяржавы прадэманстравалі, як меншымі затратамі прывесці ў парадак дарожнае пакрыццё. Міністр архітэктуры і будаўніцтва Руслан Пархамовіч расказаў пра тры асноўныя задачы, якія выконваюцца пры рамонтных работах дарог: аператыўнасць, максімальна эфектыўнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў і скарачэнне непатрэбных працэдур.

Аляксандр Лукашэнка згодны, што трэба адыходзіць ад бюракратычных перашкод. «Не трэба валакіціць, трэба рабіць хутчэй, — лічыць ён. — Трэба скончыць гэтую работу і сысці ад бюракратычных прынцыпаў. Варта рабіць па-гаспадарску і заўжды памятаць, што мы небагатыя людзі».

Прэзідэнт катэгарычна супраць бюракратызацыі. «Прыватнік хоча пабудаваць дом, а мы да яго лезем з рознымі нарматывамі, — прывёў прыклад Аляксандр Лукашэнка. — Хоча будаваць — няхай будуе. Ён жа для сябе будуе». А калі ва ўладальніка дома ўзнікне неабходнасць звярнуцца да праекціроўшчыкаў або МНС, то ён, па словах кіраўніка дзяржавы, зробіць гэта самастойна. У гэтай сувязі яшчэ адна задача — не варта скоўваць людзей фармальнымі патрабаваннямі.

Прэзідэнт азнаёміўся з тэхнікай, задзейнічанай падчас рамонтных дарожных работ. У кіроўцы бетонаўкладчыка беларускі лідар пацікавіўся, колькі гадоў той на ім адпрацаваў і ці добрая гэта машына. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка спытаўся, адкуль возяць бетон, і нагадаў сваё даручэнне аб тым, што на кожным будаўнічым аб'екце павінен быць свой міні-завод.

## «На вашых вуліцах вучым усю краіну»

Жыхары Вішова не маглі прапусціць прыезд да іх у аграгарадок кіраўніка дзяржавы. Карыстаючыся магчымасцю, падзякавалі яму за ўвагу да сельскай мясцовасці, падтрымку шматдзетных сем'яў і жыццё пад мірным небам.

«Такі гонар выпаў, што вы да нас прыехалі, — звярнулася да Аляксандра Лукашэнкі адна з жыхарак аграгарадка. — Дзякуй вам, што тут мір, што мы пенсіі своечасова атрымліваем, у такой прыгажосці жывём!»

«На вашых вуліцах вучым усю краіну, як трэба наводзіць парадак», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, як яшчэ 25-30 гадоў таму ўсе крычалі: падзяліць калгасы, саўгасы і раздаць фермерам. Іншыя казалі, што, дапамагаючы калгасам і саўгасам, Прэзідэнт закопвае грошы.

Мясцовыя жыхары заўважылі, што ім пашанцавала з кіраўніком гаспадаркі. Аграгарадок з'яўляецца часткай Бялыніцкага СВК «Калгас «Радзіма», які ўзначальвае Алег Лапацентаў. Кіраванне калгасам ён пераняў у спадчыну ад бацькі — Аляксандра Лапацентава, на сельскагаспадарчыя дасягненні якога рэгулярна спасылаецца Прэзідэнт. «Чаму і дапамагаю: таму што на яго плечы (кіраўніка гаспадаркі. — **«Зв».**) кладзецца не толькі бізнес (на полі нарыхтаваў, на ферме вырабіў, прадаў), а вуліцы, вёскі, пенсіянеры, — падтлумачыў Аляксандр Лукашэнка сваю ўвагу да развіцця сельскіх населеных пунктаў. — Усё гэта на яго плячах. Плюс — старшыня сельскага Савета. Таму я і дапамагаю калгасам, саўгасам, таму што яны глядзяць за пенсіянерамі, школамі, садкамі і іншае. Гэта не фермера работа, гэта дзяржавы. Я ад гэтага не адыходзіў. Вунь тыя, хто разбурыў, сёння ваююць. І ўжо зямля нават там не іх фермераў, а дзядзькаў з-за акіяна. І ў нас гэта было. Прыйшлося імем рэвалюцыі адбіраць. Вось для таго, каб быў мір, нам трэба ўкалываць, укалываць і ўкалываць».

> **Рыхтуйцеся да таго, што наступны год — гэта Год якасці. І на зямлі, і ў жывёлагадоўлі, і ў прамысловасці, і ў сельскай гаспадарцы, і ў абслугоўванні, і ў дарогах.**

Асаблівая падзяка кіраўніку дзяржавы ад мясцовых жыхароў — за падтрымку шматдзетных сем'яў. Яе выказала шматдзетная маці, якая выхоўвае шасцярых дзяцей. У 2017 годзе жанчына атрымлівала ордэн Маці з рук Аляксандра Лукашэнкі. У сувязі з гэтым Прэзідэнт распавёў аб уласным досведзе, калі, будучы кіраўніком гаспадаркі, ён дапамагаў шматдзетным сем'ям. Асаблівы падыход быў да тых дзяцей, чые бацькі выпівалі. «Трэба, каб грошы даходзілі да дзяцей, — такога меркавання кіраўнік дзяржавы прытрымліваецца дагэтуль. — Шматдзетным сем'ям будзем рабіць усё». У прыярытэце — і падтрымка ваеннаслужачых, якія, па словах Аляксандра Лукашэнкі, не павінны мець патрэбы ў жыллі.

> **Не трэба валакіціць, трэба рабіць хутчэй. Трэба скончыць гэтую работу і сысці ад бюракратычных прынцыпаў. Варта рабіць па-гаспадарску і заўжды памятаць, што мы небагатыя людзі.**

Мясцовыя жыхары павіншавалі беларускага лідара з Днём настаўніка. Да гэтага свята кіраўнік дзяржавы мае непасрэднае дачыненне: па першай адукацыі ён — настаўнік гісторыі і грамадазнаўства. «Цяпер вы настаўнік ужо дзяржавы! — заявілі жыхары Вішова. — Мы вам жадаем, каб вы заставаліся з намі як мага даўжэй».

У сваю чаргу Прэзідэнт адзначыў: «Мы з вамі вызначымся, як жыць далей, не хвалюйцеся. Прыйдзе час, мы выберам добрага кіраўніка. Толькі трэба акуратна і галаву на плячах трымаць!»

## «Нічога не трэба выдумляць!»

Падчас наведвання малочнатаварнага комплексу «Лямніца» СВК «Калгас «Радзіма» Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з умовамі ўтрымання буйной рагатай жывёлы, арганізацыяй вытворчасці малака і вырошчвання цялушак. Убачаным кіраўнік дзяржавы застаўся задаволены. І гэта нягледзячы на тое, што памяшканні малочнатаварнага комплексу выглядаюць даволі проста: бетонная падлога, металічныя канструкцыі, драўляныя сцены, дах з шыферу. «Гэта самае лепшае памяшканне для жывёлы», — даў высокую ацэнку ўбачанаму беларускі лідар.

Як далажыў старшыня СВК Алег Лапацентаў, памяшканні ўвялі ў эксплуатацыю ў ліпені бягучага года, у рэканструкцыю ўсяго малочнатаварнага комплексу сельгаскааператыў уклаў 2,7 мільёна рублёў. На Міншчыне, напрыклад, малочнатаварныя комплексы будуюць у два разы даражэй.

«Нічога не трэба выдумляць, — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы. — Імем рэвалюцыі трэба гэта будаваць. Гэта тое, што нам сёння трэба, каб вывесці з адрын жывёлу ў такія памяшканні».

Па яго словах, рабіць падобныя комплексы з жалезабетону каштуе каласальных затрат. А вось драўляныя памяшканні такіх выдаткаў не патрабуюць. Тым больш, каторы раз звяртае ўвагу беларускі лідар, сырод лесу жывём — бяры не хачу. Асабліва гэта актуальна пасля буралому, калі і лес можна выкарыстаць па прызначэнні, і парадак у лясным масіве навесці.

Прэзідэнт канстатаваў, што гэта самае лепшае памяшканне малочнатаварнага комплексу, якое ён бачыў. «Гэта перспектыва, вельмі выгадная справа, — падкрэсліў ён. — Танна і сярдзіта. Малайцы! Для скаціны — гэта ідэальнае ўтрыманне. Вельмі добра! Не палац. Карове палац не патрэбен. Галоўнае — прастата. Каровы накормлены, свежае паветра...»

## «Трэба імгненна пабудаваць»

Яшчэ адным пунктам рабочай паездкі Прэзідэнта на Магілёўшчыну стала наведванне ААТ «Фарэлевая гаспадарка «Лахва». Кіраўніку дзяржавы паказалі вытворчыя ўчасткі па вырошчванні каштоўных парод рыбы. Далажылі Аляксандру Лукашэнку і ў цэлым пра перспектывы развіцця рыбаводчай галіны.

«Фарэлевая гаспадарка «Лахва» з'яўляецца найбуйнейшым вытворцам фарэлі радужнай у краіне. Экспарт тавару за студзень — ліпень 2023 года склаў 725,4 тысячы долараў. Філіялы прадпрыемства размешчаны ў трох раёнах Магілёўскай вобласці. Магутнасць прадпрыемства — 500 тон фарэлі ў год.

Аднак магчымасці ў гэтай галіне, як запэўніў Прэзідэнта, у рэгіёна яшчэ большыя. Яго праінфармавалі, што ў Краснапольскім раёне, паблізу ракі Палуж, плануецца ствараць комплекс па вытворчасці рыб каштоўных парод. Вытворчая магутнасць складзе тысячу тон фарэлі ў год. Папярэдні кошт праекта — каля 40 мільёнаў беларускіх рублёў. Яшчэ адзін рыбаводчы комплекс па вытворчасці апладненай ікры фарэлі радужнай з'явіцца ў Чэрыкаве. Яго будаўніцтва будзе каштаваць амаль 35 мільёнаў беларускіх рублёў. Праектная магутнасць складзе 25 мільёнаў ікрынак у год. Цяперашняя патрэба Беларусі ў апладненай ікры — 4 мільёны ікрынак у год. Пакуль яна завозіцца па імпарце. Спецыялісты пераконваюць: вытворчасць апладненай ікры — справа перспектыўная.

Аляксандр Лукашэнка падтрымаў рэалізацыю гэтых двух праектаў. «Нават калі будзе не хапаць, пазычым крыху грошай, — паведаміў ён. — Але трэба гэта імгненна пабудаваць. Давайце будзем гэтыя два праекты рэалізоўваць».

У сувязі з гэтым Прэзідэнт нагадаў, што ў адной з гаспадарак краіны ўжо асвоілі вытворчасць чорнай ікры, якая па смакавых якасцях выйграе на сляпых дэгустацыях, атрымлівае высокія ацэнкі спецыялістаў. «Калі мы гэта можам рабіць і гэта добрая прыбытковасць, маржынальнасць, ну дык давайце пабудуем больш, — прапанаваў Аляксандр Лукашэнка. — Сядзьце і падумайце, што мы можам выбаўць тут (у Беларусі. — **«Зв».**), якую рыбу. Корм ёсць».

Вытворчасць сучасных камбікармоў, у тым ліку для рыб, наладжана ў Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі. Такім чынам, з улікам даручэнняў, дадзеных кіраўніком дзяржавы падчас паездкі на Магілёўшчыну, можна быць упэўненымі ў тым, што планы павелічэння аб'ёмаў вытворчасці каштоўных відаў рыб, прадугледжаных Дзяржаўнай праграмай «Аграрны бізнес» на 2021—2025 гады, будуць не проста выкананы, а можа, і перавыкананы.

**Вераніка КАНЮТА.**
*Бялыніцкі раён.*

Наталля КАЧАНАВА:

# «НЯМА БОЛЬШ ДОБРАЙ І ПАТРЭБНАЙ ПРАФЕСІІ, ЧЫМ НАСТАЎНІК»

**Напярэдадні Дня настаўніка Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з актывам Беларускага саюза жанчын Маскоўскага раёна Мінска. Сустрэча прайшла ў Цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ранак». Спікер верхняй палаты парламента расказала пра заканатворчую дзейнасць і пытанні сацыяльнай палітыкі і нацыянальнай бяспекі нашай дзяржавы, запрасіла жанчын да шчырага дыялогу і прапанавала звяртацца з любымі пытаннямі. Напрыканцы сустрэчы Наталля Качанава ўзнагародзіла найлепшых педагогаў падзякамі Старшыні Савета Рэспублікі.**



Фота БелТА.

## Людзі, якія пакідаюць светлы след

У зале сапраўды было шмат настаўнікаў і педагогаў, а ў фае цэнтра арганізавалі выставу як музейных экспанатаў, даследаваннем якіх займаюцца школьнікі, так і творчасці дзяцей і саміх педагогаў. Напрыклад, свае работы прадставіла член БСЖ, старшы выкладчык кафедры генетыкі біялагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта Лія Кучко.

— Вы, упэўнена, выдатны педагог, бо такія работы можа напісаць толькі чалавек са шчырым і добрым сэрцам, — падзялілася меркаваннем Наталля Качанава, пазнаёміўшыся з Ліяй Сямёнаўнай.

Увогуле, з нагоды Дня настаўніка Наталля Іванаўна адзначыла, што няма больш добрай і патрэбнай прафесіі, чым настаўнік.

— Настаўнік — той чалавек, з якім у жыцці сустракаецца кожны, і ён пакідае ў нас след на ўсё жыццё. Канешне, роля настаўніка вялікая: гэта і адукацыя, і выхаванне юнага пакалення. Усе мы праносім праз жыццё вобраз таго настаўніка, які ў дзяцінстве пакінуў уражанне не толькі як педагог, але і добры сябар. Таму напярэдадні прафесійнага свята хачу падзякаваць нашым педагогам, настаўнікам, выхавацелям, якія займаюцца такой нялёгкай, але вельмі патрэбнай нам працай. Усім ім нізкі паклон і шчырыя словы ўдзячнасці, — сказала Наталля Качанава.

Размову з актывам БСЖ спікер Савета Рэспублікі пачала, адзначыўшы, што такія сустрэчы праводзяцца ва ўсіх рэгіёнах. Зусім нядаўняя прайшла ў Віцебскай вобласці.

— Такі дыялог дае нам магчымасць прымаць правільныя рашэнні на карысць нашай краіны і нашага народа, — адзначыла Наталля Качанава. Далей яна пазнаёміла прысутных з дзейнасцю Савета Рэспублікі.

## Законы ідуць ад жыцця

— За мінулую сесію, якая доўжылася з верасня 2022-га да ліпеня 2023 года, адпрацавана 302 законапраекты, якія былі прынятыя і падпісаны. Цяпер працуем над планам законапраектаў на 2024 год, — расказала спікер Савета Рэспублікі.

Яна падкрэсліла, што ўсе законы ідуць ад жыцця.

— Пасля 2020 года мы ўбачылі, што варта мяняць, напрыклад, Закон «Аб масавых мерапрыемствах». Мы сутыкнуліся з тым, што людзі не разумелі, што ёсць закон, які нельга пераступаць, бо пачынаецца хаос. Таму і ўнёслі змены ў крымінальны, крымінальна-працэсуальны кодэксы, — расказала Наталля Качанава.

Таксама нагодай для карэкціроўкі заканадаўства нярэдка становяцца звароты грамадзян і нават дзелавыя паездкі.

— У Расіі з Валянцінай Іванаўнай Матвіенка мы наведвалі манастыр, і я ўбачыла, якія выдатныя ўстановы створаны пры жаночых манастырах. Гэта прытулкі для дзетак, якія засталіся без бацькоў, яны там выжывуць і вучацца. Я падумала: чаму б заканадаўча не дазволіць гэта ў нас? Калі такая магчымасць і патрэба ў святароў ёсць, было б, магчыма, і нядрэнна. Мы прапанавалі і паглядзім, як гэта спрацуе, — падзялілася Старшыня Савета Рэспублікі.

Таксама яна выказала меркаванне, што за непрацяглую суверэнную гісторыю нашай краіны пабудавана выдатная незалежная дзяржава.

— Прыгожая, дагледжаная, добраўпарадкаваная, з усім тым, што сёння для нас вельмі важна. Як сказаў нядаўна Прэзідэнт на сустрэчы з маёй калегай з Узбекістана, наша палітыка — гэта жыццё нашых людзей. Яшчэ адзін тэзіс, які агучвае кіраўнік нашай дзяржавы, — справядлівасць і справядлівыя адносіны да людзей і ўсяго таго, чым мы займаемся. Пабудаваўшы такую краіну, мы мусім зрабіць усё, каб гэты суверэнітэт і незалежнасць захаваць, — падкрэсліла Наталля Качанава.

## Прыярытэт — сацыяльная справядлівасць

Звярнулася спікер Савета Рэспублікі і да пытанняў сацыяльнай палітыкі. Яна расказала, што ў хуткім часе ў Полацку будзе арганізавана акцыя «Шчаслівая сям'я», дзе ўрачы, педагогі, святары, тыя, хто працуе з моладдзю, паразважаюць пра ролю бацькі і маці, сямейныя каштоўнасці.

— Нас не можа не непакоіць, што нашы маладыя людзі сёння позна ўступаюць у шлюб — у 27 ці 28 гадоў. Сярэдні ўзрост, у якім жанчына нараджае першае дзіця, — 27 гадоў ці нават больш. Дзяўчаты думаюць пра кар'еру, хлопцы — пра кватэру, машыну, добрую работу, а дзеці — потым. А потым, на жаль, позна. Усё ў гэтым жыцці варта рабіць своечасова. І, паважаныя жанчыны, наша з вамі работа — тлумачыць, гаварыць пра гэта, у тым ліку і ў сям'і.

Наталля Качанава нагадала, што каля 50 % рэспубліканскага кансалідаванага бюджэту ідзе на сацыяльныя расходы — ахову здароўя, адукацыю, ахову і бяспеку, навуку, культуру, спорт і фізічную культуру. А ў гарадах і раёнах гэта лічба даходзіць да 70 % бюджэту. А бюджэт — гэта падаткі людзей, якія працуюць.

— У Мінску колькі людзей, якія не працуюць, і не ўсе з іх бедныя. І тыя, хто працуе і робіць унёсак у эканоміку, карыстаюцца бясплатнай адукацыяй і аховай здароўя, і тыя, хто не працуе, — таксама. Але ж патрэбна сацыяльная справядлівасць. Можна не працаваць па розных прычынах, і я зараз не маю на ўвазе хворых людзей ці з інваліднасцю. І мы думаем над тым, каб не прымаць непапулярныя меры, з аднаго боку, а з іншага — каб была сацыяльная справядлівасць, — удакладніла Наталля Качанава.

Яна паведаміла, што ў хуткім часе ў сталіцы пад кантроль возьмуць праходжанне дыспансерызацыі.

— У Мінску дыспансерызацыю паставім на жорсткі кантроль і зробім яе рэальнай, трэба сыходзіць ад фармалізму. Але разам з тым медыкаў трэба падтрымліваць, — адзначыла яна, праінфармаваўшы, што на 2024 год на сістэму аховы здароўя выдаткавана 11 мільярдаў рублёў. — Будуюцца паліклінікі, новыя карпусы бальніц, выбудавана сістэма, пачынаючы ад ФАПаў да РНПЦ, чатыры ВНУ рыхтуюць спецыялістаў, а колькі сёння праблем? Чалавек не можа трапіць у РНПЦ, а так быць не павінна! Чалавек павінен атрымаць кваліфікаваную медыцынскую дапамогу, і няважна, дзе ён жыве. Калі па месцы жыхарства няма магчымасці яе аказаць, значыць, трэба аказаць у Мінску. Людзі шукаюць выхады на службовую асобу, каб аказалі дапамогу яго блізкаму. Так не павінна быць!

Наталля Качанава адзначыла, што ў хуткім часе будуць апрабаваны новыя формы работы, каб анколагі не атрымлівалі хворых на 3-4 стадыі. Сістэма па выяўленні на ранняй стадыі небяспечных захворванняў будзе ўдасканалена.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Пакістане падчас выбухаў у мячэцях загінулі дзясяткі чалавек



У выніку двух магутных выбухаў у мячэцях у розных правінцыях Пакістана дзясяткі чалавек загінулі, сотні паранены, паведаміла «Бі-бі-сі». Першы выбух прагрымеў у горадзе Мастунг, што ў правінцыі Белуджыстан, там загінулі больш за 50 чалавек, па меншай меры сто параненыя. У выніку другога абрынулася мячэць у горадзе Хангу ў правінцыі Хайбер-Пактунхва, пад абломкамі апынуліся каля 40 чалавек. Улады Белуджыстана паведамляюць, што выбух на іх тэрыторыі здзейсніў смяротнік, які падарваў сябе ў паліцэйскай машыне, прыпаркаванай каля мячэці. Мэтай сталі вернікі, якія сабраліся на святкаванне дня нараджэння прарока Махамеда. Сярод загінулых ёсць таксама афіцэры паліцыі. Раней Белуджыстан часта падвяргаўся нападам баевікоў пакістанскага «Талібана» і «Ісламскай дзяржавы», а таксама іншых радыкалаў. Апошні напад адбыўся ў пачатку верасня. Тады пры выбуху былі паранены 11 чалавек, у тым ліку мясцовыя высокапастаўленыя духоўныя лідары. Апошні раз напад на мячэць у Пакістане адбыўся сёлета ў студзені ў Пешавары. Тады тэракт, які быў здзейснены смяротнікам, забраў жыцці 100 чалавек. Як адзначае «Бі-бі-сі», новая серыя выбухаў адбылася на фоне спроб пакістанскіх улад узмацніць меры бяспекі напярэдадні агульнанацыянальных выбараў, прызначаных на студзень 2024 года.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне Прэзідэнту Ісламскай Рэспублікі Пакістан Арыфу Алві, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. «Акты тэрарызму ў дзень нараджэння прарока Мухамеда — злачынствы супраць усяго ісламу і рэлігійнага свету ў цэлым. Упэўнены, што вінаватыя панясуць адпаведнае пакаранне», — адзначаецца ў спачуванні.**

## Дзяржджэпартамент ЗША рыхтуецца да магчымага шатдаўну ўрада



Дзяржджэпартамент Злучаных Штатаў Амерыкі рыхтуецца да магчымага шатдаўну ўрада з 1 кастрычніка. Пра гэта паведаміла агенцтва РІА «Новости», спасылаючыся на заяву афіцыйнага прадстаўніка ведамства Мэцью Мілера. Па словах прадстаўніка Дзяржджэпа, у федэральным органе выканаўчай улады пры ўрадзе ЗША ідзе працэс распрацоўкі плана на выпадак узнікнення непрадбачаных абставінаў, калі адбудзецца шатдаўн. Шатдаўн магчымы з 1 кастрычніка ў тым выпадку, калі кангрэс не прыме паўнавартасны або кароткатэрміновы бюджэт краіны да канца гэтага фінансавага года. Як паведаміла ТАСС, раней прэзідэнт ЗША выказаў меркаванне, што прыпыненне дзейнасці федэральнага ўрада прывядзе да катастрафічных наступстваў для краіны, асабліва ў доўгатэрміновай перспектыве. Байдэн плануе застацца ў Вашынгтоне на гэтых выхадных, што з'яўляецца адносна рэдкай з'явай. Звычайна ў пятніцу пасля абеду ён з'язджае ў адзін са сваіх дамоў у Дэлавэр або ў Кэмп-Дэвід.

## Студэнты разбілі палаткі перад парламентам Францыі з-за жыллёвага крызісу



Паводле заявы, апублікаванай прафсаюзам L'Union Etudiante ў сацсетцы X, студэнты ў Парыжы выказалі сваю незадаволенасць дрэннымі жыллёвымі ўмовамі з дапамогай гэтага сімвалічнага акта. Пра гэта паведаміла A News. У гарадах Бардо і Ліль студэнты таксама разбілі палаткі ў стратэгічна важных месцах побач з навучальнымі ўстановамі. «Лагеры арганізоўваюцца ў горадзе і па месцы вучобы, — адзначылі ў L'Union Etudiante. — Нашы прафсаюзы мабілізаваны па ўсёй Францыі, каб папярэдзіць пра дрэнныя ўмовы пражывання студэнтаў». Жыллё ў краіне стала рэзка не хапаць пасля прыбыцця мноства мігрантаў, якія занялі большасць танных муніцыпальных і прыватных кватэр.

На сваім месцы

# ВУЧЫЦЬ, АЛЕ І ВУЧЫЦЦА...

## Маладыя педагог аб першых поспехах і «шышках» у класах і калектывах

**У Гомельскай вобласці адзін з найважнейшых кірункаў комплекснага развіцця раёнаў, якія пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС, — замацаванне маладых спецыялістаў. У Веткаўскім раёне ўжо больш як месяц на першых працоўных месцах паказваюць сябе навабранцы-педагогі. Значная колькасць сёлетніх выпускнікоў ВНУ і каледжаў вярнулася пасля вучобу працаваць у родны раён. Карэспандэнт «Звязды» пацікавілася, як на Веткаўшчыне маладым людзям дапамагаюць асвойвацца ў новых калектывах.**



### Дзеці мяняюць...

Дар'я Казубанава сама родам з Веткі. Пасля школы паступіла ў Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны без мэтавага накіравання, так што разлічвала на агульнае размеркаванне. Дар'ю як выдатніцу вучобы факультэта матэматыкі і тэхналогіі праграмавання ГДУ яшчэ падчас вучобы запрашалі да сябе на працу адразу некалькі школ Гомеля. Ужо з трэцяга курса студэнтка сумяшчала вучобу і працу ў школе ў цэнтры Гомеля. У гэтым годзе дзяўчына скончыла ВНУ з «чырвоным» дыпломам. Маладога выкладчыка матэматыкі і інфарматыкі ўгаворвалі размеркавацца ў Гомель і застацца працаваць у той жа школе. Але Дар'я настаяла, каб яе размеркавалі ў родны Веткаўскі раён. Прынялі маладога матэматыка на першае працоўнае месца ў Радужскай сярэдняй школе імя М. Р. Батракова.

Дар'я Сяргееўна пакуль жыве на здымнай кватэры ў Гомелі. Дабіраецца на працу — крыху больш чым 20 кіламетраў ад Гомеля — сваім ходам. Але яна ўпэўнена, што дакладна зможа атрымаць кватэру ў арэндным жыллі ў Ветцы. Сістэма ў раёне выпрацаваная: жыллё для маладых спецыялістаў узводзіцца за кошт сродкаў, накіраваных на ліквідацыю наступстваў катастрофы на ЧАЭС.

Хутка малады матэматык Радужскай сярэдняй школы імя М. Р. Батракова таксама прадставіць неабходныя дакументы, каб стаць на ўлік для атрымання жылля. Увогуле сваё размеркаванне ў аграгарадок на Веткаўшчыне малады спецыяліст лічыць падарункам лёсу.

— Ішла на працу ўжо цалкам падрыхтаваная і маральна, і псіхалагічна. Выкладаю матэматыку з пятага да дзясятага класа, інфарматыку — у 8—11-х, а таксама вяду чарчэнне ў 10-м. Тут у класах у мяне менш вучняў, чым было ў гомельскай школе: мінімальна — пяць чалавек, максімальна — пятнаццаць. Я магу больш удзяляць увагі кожнаму дзіцяці, — расказвае малады педагог.

Нягледзячы на тое, што Дар'я Сяргееўна толькі прыступіла да работы, яна ўжо вядзе дадатковыя занятки: рыхтуе вучня пятага класа да алімпіяды, займаецца з вучнямі дзявятага класа па падрыхтоўцы да выпускнога іспыту.

— У калектыве мяне прынялі вельмі добра. Наша школа беларускамоўная, па-беларуску выкладаюцца і ўрокі, і факультатывы. Напачатку звярталася па дапамогу да настаўнікаў, каб разабрацца з вядзеннем дакументацыі па факультатыве па-беларуску, — адзначае дзяўчына. — Кіраўніцтва школы заключыла са мной кантракт на пяць гадоў. Як малады педагог я атрымала аднаразовую выплату — 200 базавых велічынь, яна выплачваецца за заключэнне першага пяцігадовага кантракта за работу ва ўстанове, якая знаходзіцца ў зоне радыеактыўнага забруджвання з правам на адсяленне. Таксама атрымала 60 базавых велічынь. Гэта аднаразовая выплата па такім жа артыкуле закона, але ўжо за заключэнне кантракта тэрмінам на тры і больш гадоў, — дадае дзяўчына.

Тое, што малады педагог так добра дасведчаная ў сацыяльных ільготах, не дзіўна. Парад пачаткам работы з маладымі педагогамі правялі асобную сустрэчу, дзе дакладна растлумачылі, як забяспечаныя ў гэтым плане ў раёне законныя правы спецыялістаў на першых працоўных месцах.

### Сістэма настаўніцтва і не толькі...

Між тым сёлета ва ўстановы адукацыі і спорту Веткаўшчыны размеркаваліся 15 маладых спецыялістаў, дзевяць маладых людзей — ураджэнцы раёна. Сярод маладога папаўнення кадраў — настаўнікі пачатковых класаў, матэматыкі і інфарматыкі, замежнай мовы, працоўнага навучання, біялогіі і хіміі, а таксама трэнер-настаўнік фізкультуры, медыцынская сястра. Усе маладыя людзі працаўладкаваны на поўныя стаўкі, ім забяспечаны аб'ёмы педагагічнай нагрузкі. Не менш важна і тое, што за кожным маладым спецыялістам у калектыве замацаваны дасведчаны настаўнік.

— З 12 маладымі спецыялістамі заключаны кантракты з аднаразовай выплатай за работу ў зоне радыеактыўнага забруджвання ў памеры 40—60 базавых велічынь, шэсць чалавек заключылі з наймальнікамі пяцігадовыя кантракты з аднаразовай выплатай 200 базавых велічынь, — звярнуў увагу **старшыня Веткаўскай раённай арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Васіль САМКОЎ.**

Атрыманне арэнднага жылля, пераканаы лідар галіновага прафсаюза раёна, добры стымул для моладзі замацавацца па месцы працы і жыхарства.

— Сем маладых спецыялістаў устаноў адукацыі і спорту пастаўлены на ўлік як тыя, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Ім будзе гарантавана забеспячэнне добраўпарадкаванага арэнднага жылля, — кажа Васіль Васільевіч.

Пакуль жа для кожнага маладога спецыяліста-педагога, размеркаванага ў раён, вызначана месца пражывання.

### Дапамога з дакументамі і жывы дыялог

Каб «зняць» усе хваляванні не толькі педагогаў-пачаткоўцаў, але і іх бацькоў, у раёне правялі сустрэчу з маладымі спецыялістамі. Запрасілі на яе прадстаўнікоў раённых службаў і ведамстваў, кіраўніцтва аддзела адукацыі, райкам галіновага прафсаюза.

— Наша задача — каб малады педагог прыступіў да працы і ведаў аб сваіх сацыяльных гарантыях, — падкрэслівае Васіль Самкоў. — Таму важна было растлумачыць маладым людзям пытанні, якія датычацца прафесійнай дзейнасці, ільгот і гарантый, выплаты і памераў зарплаты, забеспячэння арэндным жыллём, атрымання льготных крэдытаў, а таксама асабістай адказнасці педагога згодна з Кодэксам аб адукацыі.

Акрамя таго, на падобных сустрэчах з маладымі педагогамі выпрацавана практыка абавязковай метадычнай дапамогі.



**Начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Веткаўскага райвыканкама Таццяна ПОМАЗАВА і старшыня Веткаўскай раённай арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Васіль САМКОЎ сустрэліся на першым працоўным месцы з маладым спецыялістам Дар'яй КАЗУБАНАВАЙ.**

— Падрабязна разбіраецца ўся дакументацыя, якую будуць весці спецыялісты на першым працоўным месцы. На пачатковым этапе працы для іх гэта сапраўды важна, — у сваю чаргу робіць важны акцэнт **начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Веткаўскага райвыканкама Таццяна ПОМАЗАВА.** — Яшчэ перад працаўладкаваннем выпускнікі ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія размеркаваліся да нас, атрымалі магчымасць наведаць установы, куды будуць накіраваныя. Юнакі і дзяўчаты паразмаўлялі з калегамі па працы і старшынямі органаў прафсаюза на месцах. Для нас вельмі важна і тое, каб маладыя людзі, калі прыступаюць да працы, разумелі і свае службовыя абавязкі, асаблівасці прымянення норм заканадаўства праз калектыўны, працоўны дагаворы, Правілы ўнутранага працоўнага распарадку. Важна разуменне маладой змены і ўмоў работы ва ўстановах у зоне радыеактыўнага забруджвання, — звярнула ўвагу Таццяна Аляксандраўна.

Па яе словах, сёння на Веткаўшчыне вельмі добра зарэкамендаваў сябе такі фармат падтрымкі маладога папаўнення кадраў, калі старшыня райвыканкама праводзіць асабістую сустрэчу з маладымі спецыялістамі. Так, кіраўнік раёна можа асабіста даведацца ад пачынаючых працаўнікоў, як яны ўладкаваліся на першых рабочых месцах. Акрамя таго, наведванне па месцы размеркавання маладых спецыялістаў абавязкова ўваходзіць у план мабільных груп Веткаўскага райвыканкама.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

Спажывецкі кошык

## Прафсаюзы параілі набываць гародніну ў запас

**Цэны на макарону, ячныя крупы, рыс, маргарын, масла, алей, пшанічную муку, цукар, соль, малако і тварог за апошні месяц не змяніліся, а рэальная зарплата жніўня аказалася на 15,1 % вышэйшай, чым заробак леташняга жніўня. Пры гэтым агульны ўзровень спажывецкіх цэн у жніўні ў параўнанні з ліпенем 2023-га знізіўся на 0,3 %. Да такіх высноў прыйшлі прафсаюзныя работнікі ў выніку маніторынгу.**

Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі штомесяц аналізуе кошт і наяўнасць спажывецкіх тавараў у рознічнай гандлёвай сетцы, робячы высновы, як суадносіцца рост цэн і заробку. У верасні даследаванне правялі ў 218 крамах — сеткавых супермаркетах і крамах крокавай даступнасці.

Спецыялісты сцвярджаюць, што сярэдні кошт плодаагароднінnага набору — капуста, бульба, морква, бурак, цыбуля, яблык (усё па кілаграме) у верасні склаў 8,17 рубля. У параўнанні са жніўнем цана зменшылася на 26 %.

Найтаннейшы набор аказаўся на Брэстчыне — 7,75 рубля, а самы дарагі — у Магілёўскай (8,29 рубля) і Мінскай (8,71 рубля) абласцях. Так што цяпер самы час набываць гародніну пра запас, тым больш што гэта можна зрабіць на шматлікіх кірмашах, параілі прадстаўнікі ФПБ.

Цэны на іншыя тавары вагаюцца. У параўнанні з пачаткам 2023-га значна паменшаў кошт алею (амаль на 20 %), растваральнай кавы (на 7 %) і паўцвёрдага сыру (на 4 %). А вось каўбасныя вырабы, рыба (жывая і маражаная), селядзец і «кандытарка» ў верасні нязначна падаражэлі.

— Цэны знаходзяцца пад кантролем, выкананне задач, пастаўленых Прэзідэнтам, утрымлівае рынак ад рэзкіх хістанняў, — падсумавала вынікі маніторынгу **Алена МАНКЕВІЧ, намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.** — Нязначная дэфляцыя, якая назіраецца па харчовай групе, — станоўчая тэндэнцыя. У той жа час мы бачым рост рэальных зарплат, а таксама тое, што інфляцыя знаходзіцца ніжэй нават прагнозных паказчыкаў. Прафсаюзы толькі вітаюць гэта і заўжды выступаюць за тое, каб заробкі раслі хутчэй за цэны.

У ФПБ удакладнілі, што зніжэнне сярэдняга ўзроўню цэн на значную групу прадуктаў харчавання адбываецца на фоне заўважнага росту заробку. Намінальная налічаная сярэдняя зарплата ў студзені—жніўні склала 1834,4 рубля, а за жнівень 2023-га — 1962,4 рубля. Адпаведна вырасла і рэальная зарплата, якая разлічваецца з папраўкай на ўзровень інфляцыі. У студзені—жніўні сёлета тэмп росту рэальнага заробку склаў 109,3 % у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам.

**Ірына СІДАРОК.**

## НОВАЕ МЕСЦА БДУ Ў СУСВЕТНЫМ РЭЙТЫНГУ

**У рэйтынгу Times Higher Education (THE) Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт заняў новыя пазіцыі. На працягу дзевяці гадоў ён застаецца адзіной з айчынных ВНУ, якая ўваходзіць у гэты рэйтынг. Паводле апублікаванага 27 верасня юбілейнага дваццатага выпуску Times Higher Education, БДУ з катэгорыі 1501+ перайшоў у катэгорыю 1201+.**

Усяго ў рэйтынг уключаны 1904 ВНУ з каля 30 тысяч дзеючых. Для таго каб трапіць у ранжыраваную сістэму, у ВНУ павінна быць не менш як 1000 публікацый у міжнароднай рэфератыўнай базе даных за 2018—2022 гады пры выкананні нормы выдання 150 работ за год. Пры гэтым 769 універсітэтаў знаходзяцца ў статусе «прэтэндэнта» на ўключэнне ў рэйтынг. Сярод іх ёсць і шэсць беларускіх ВНУ: БДУІР, БДМУ, Універсітэт грамадзянскай абароны МНС, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны, Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт і Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы.

Як патлумачылі ў прэс-службе БДУ, для ацэньвання ўніверсітэтаў рэйтынг выкарыстоўвае пяць груп крытэрыяў: «Даследчае асяроддзе», «Якасць даследаванняў», «Адукацыйная дзейнасць», «Міжнароднае супрацоўніцтва» і «Прамысловыя інавацыі». У новым юбілейным выпуску крытэрыі ацэнкі былі перапрацаваны. Замест 13 індыкатараў сталі выкарыстоўваць 18, а таксама атлімізавалі формулы разліку. БДУ атрымаў высокія ацэнкі па індыкатарах інтэрнацыяналізацыі (ацэнка долі замежных навучэнцаў вырасла з 71 да 77 балаў), а таксама палепшыў некаторыя іншыя паказчыкі, што дазволіла ўніверсітэту заняць больш высокую пазіцыю.

У тройку лідараў рэйтынгу ўвайшлі Універсітэт Оксфарда, Стэнфардскі ўніверсітэт і Масачусецкі тэхналагічны інстытут. Сярод краін-суседзяў Беларусі ў рэйтынгу самыя высокія пазіцыі займаюць расійскія ўніверсітэты, у тым ліку МДУ імя М. В. Ламаносава, Маскоўскі фізіка-тэхнічны інстытут і Санкт-Пецярбургскі політэхнічны ўніверсітэт Пятра Вялікага.

Разам з Шанхайскім і QS рэйтынгамі THE ўваходзіць у вялікую тройку самых аўтарытэтных сусветных рэйтынгаў. Усяго БДУ прадстаўлены ў дзевяці глабальных рэйтынгах універсітэтаў свету, уключаючы QS з 387 месцам, у 12 прадметных рэйтынгах, у тым ліку і ў прадметным шанхайскім рэйтынгу па фізіцы, а таксама ў розных тэматычных і спецыялізаваных рэйтынгах.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# МІНСК І ПЕКІН СТАНОВЯЦЦА БОЛЬШ БЛІЗКІМІ

**Адносіны паміж Беларуссю і Кітаем становяцца больш блізкімі. Пра гэта заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Се Сяаюн на ўрачыстым прыёме ў Мінску з нагоды 74-й гадавіны з дня абвяшчэння КНР.**

«Апора на ўласныя сілы і ўпартая праца з'яўляюцца невычэрпнай рухальнай сілай Кітая на шляху да вялікіх дасягненняў», — адзначыў Се Сяаюн. У першым паўгоддзі аб'ём ВУП Кітая склаў 59,3 трыльёна юаняў — рост на 5,5 працэнта у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

— Гэта значна хутчэй, чым рост эканомікі на 3 працэнты на працягу ўсяго мінулага года, а таксама значна хутчэй, чым рост эканомік вядучых развітых краін свету, што сведчыць аб моцнай устойлівасці эканамічнага развіцця Кітая, — падкрэсліў пасол. — Навукова-тэхналагічная самастойнасць высокага ўзроўню няўхільна развіваецца: ад нанатэхналогій, 3D-друку да квантавай інфармацыі, штучнага інтэлекту і далей да пілатаваных касмічных палётаў і месяцовай праграмы. Навукова-тэхналагічнае развіццё зведала сур'ёзныя гістарычныя, цэласныя і структурныя змены. Кітай рэзка падняўся ў рэйтингу Глабальнага індэкса навукова-тэхнічных інавацый і паспяхова ўвайшоў у лік дзяржаў інавацыйнага тыпу.

Кітай праводзіць палітыку рэформаў і адкрытасці, адкрывае свой унікальны па ёмістасці рынак і шчодра дзеліцца магчымасцямі адкрытасці. За апошнія 10 гадоў сярэдні ўклад КНР у сусветны эканамічны рост перавысіў 30 працэнтаў.

— Дасягнуць поспеху самому і ў той жа час прынесці карысць усяму свету — у гэтым місія развіцця Кітая, — падкрэсліў Се Сяаюн. — Шлях кітайскай мадэрнізацыі разбурае састарэлую логіку, згодна з якой «моцная краіна абавязкова павінна імкнуцца да гегемоніі», пазбягае старога заходняга шляху мадэрнізацыі, які складаецца ў стварэнні каланіяльнай сістэмы, захопе сферы ўплыву і знешняй узброенай экспансіі, разбурае міф пра тое, што мадэрнізацыя можа ажыццяўляцца толькі заходнім капіталістычным шляхам, пашырае шлях мадэрнізацыі краін, якія развіваюцца, і дае новы выбар тым краінам і народам свету, якія хочуць паскорыць развіццё, захоўваючы пры гэтым сваю незалежнасць.

Сутыкнуўшыся з такімі пагрозамі міру і развіццю, як унілатэралізм, пратэкцыянізм і гегеманізм, Кітай ставіць сваёй мэтай фарміраванне супольнасці адзінага лёсу чалавецтва і імкнецца стаць будаўніком міру ва ўсім свеце, удзельнікам глабальнага развіцця, абаронцам міжнароднага парадку, пастаўшчыком грамадскіх даброт. Сярод іх — сумеснае будаўніцтва ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях», Ініцыятывы па глабальным развіцці, глабальнай бяспекі, ініцыятывы «Глабальная цывілізацыя».

Да 10-годдзя сумеснага будаўніцтва «Аднаго пояса, аднаго шляху» больш за 150 краін і 32 міжнародныя арганізацыі падпісалі з Кітаем звыш 200 дакументаў аб супрацоўніцтве. У рамках ініцыятывы сфарміравана больш за 3 тысячы праектаў супрацоўніцтва, задзейнічаны інвестыцыі памерам у амаль трыльён долараў, створана больш за 400 тысяч працоўных месцаў у краінах уздоўж маршруту, ініцыятыва стала платформай міжнароднага супрацоўніцтва, якая выходзіць за рамкі геаграфічных абмежаванняў, пераадольвае культурныя адрозненні, інтэгруе патрэбы развіцця і вітаецца ўсімі краінамі.

— «Тры важныя ініцыятывы» дэманструюць канцэпцыю глабальнага развіцця, арыентаваную на народ, агульную, усеабдымную, сумесную, устойлівую канцэпцыю глабальнай бяспекі, канцэпцыю глабальнай цывілізацыі, прасоўваючы роўнасць, узаемнае навучанне, дыялог і інклюзіўнасць, — адзначыў Се Сяаюн. — На фоне найвялікшых змяненняў, нябачаных за стагоддзе, яны паказваюць шлях да ўсеагульнага міру і развіцця, абменаў і ўзаемнага навучання паміж цывілізацыямі, атрымалі ўсеагульнае прызнанне ад краін усяго свету і шырокую падтрымку на шматбаковым узроўні.

Аднадумства, узаемная выгада і ўзаемны выйгрыш з'яўляюцца яркім адлюстраваннем кітайска-беларускіх адносін.

— За 31 год з моманту устанаўлення дыпламатычных адносін кітайска-беларускае ўзаемадзеянне не вытрымала выпрабаванні міжнароднай абстаноўкі, якая імкліва змяняецца, і бесперапынна здзяйсняюць новыя прарывы, — адзначыў пасол. — Асабліва ў апошнія гады пад стратэгічным кіраўніцтвам і дзякуючы асабістаму садзейнічанню Старшыні КНР Сі Цзіньпіна і Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі кітайска-беларускае супрацоўніцтва ў розных галінах дасягае плённых вынікаў. Па-першае, двухбаковыя адносіны становяцца больш «жалезнымі». У верасні мінулага года кіраўнікі дзвюх дзяржаў правялі гістарычную сустрэчу ў Самаркандзе, у ходзе якой зрабілі сумесную заяву аб павышэнні ўзроўню кітайска-беларускіх адносін да ўзроўню ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства, адносіны паміж дзвюма краінамі ажыццявілі гістарычны скачок.

Як заўважыў кіраўнік дыпламатычнай місіі, міжнароднае супрацоўніцтва становіцца мацнейшым: «Абодва бакі падтрымліваюць адзін аднаго ў пытаннях, якія датычацца ключавых інтарэсаў адзін аднаго, падтрымліваюць цесную каардынацыю ў міжнародных справах і эфектыўна абараняюць прынцыпы шматбаковасці і агульныя інтарэсы краін, якія развіваюцца».

— Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва прыносіць усё больш рэальнай карысці. Са студзеня да жніўня гэтага года тавараабарот паміж Кітаем і Беларуссю дасягнуў 5,83 мільярда долараў, павялічыўшыся ў гадавым вылічэнні прыкладна на 97 працэнтаў, — паведаміў Се Сяаюн. — Кітай стаў другім па велічыні гандлёвым партнёрам Беларусі, а Беларусь у сваю чаргу — важным гандлёвым партнёрам Кітая ў Еўразійскім рэгіёне. Колькасць рэзідэнтаў Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка, сапраўднай «жамчужыны» «Аднаго пояса, аднаго шляху», дасягнула 114 прадпрыемстваў, аб'ём заяўленых інвестыцый перавышае 1,3 мільярда долараў.

Адносіны паміж народамі насамрэч становяцца больш блізкімі. Як паведаміў кіраўнік дыпламатычнай місіі, «бліскуча прайшлі мерапрыемствы-брэнды ў сферы культуры, такія як «Чай для гармоніі свету» і «Тыдзень турызму і культуры Кітая». Колькасць студэнтаў, якія прыязджаюць на вучобу ў краіны адзін аднаго, працягвае павялічвацца, імкліва пашыраецца выкладанне кітайскай мовы ў Беларусі. Як падкрэсліў Се Сяаюн, «супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, навукі і тэхналогій, культуры, аховы здароўя і іншых галінах працягвае прыносіць плён, спрыяючы ўзаемаразуменню і збліжэнню двух народаў».

— Знаходзячыся на новым гістарычным адпраўным пункце двухбаковых адносін, кітайска-беларускае супрацоўніцтва мае светлую будучыню і шырокія перспектывы, — падкрэсліў пасол КНР. — Я гатовы прыкладаць намаганні разам з беларускімі сябрамі для рэалізацыі важных дамоўленасцяў, дасягнутых кіраўнікамі дзвюх дзяржаў, умацавання палітычнага ўзаемадавеpу, пашырэння ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, развіцця традыцыйнай дружбы, сумесна ствараць яшчэ больш выдатную будучыню кітайска-беларускіх адносін і ўносіць уклад кітайскіх і беларускіх сіл у пабудову новага тыпу міжнародных адносін і Супольнасці адзінага лёсу чалавецтва.

Кітай, цвёрда трымаючыся стратэгічнага курсу Старшыні Сі Цзіньпіна, прымнажае шматвяковыя традыцыі дзяржаўнага будаўніцтва. Пра гэта заявіў першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Мікалай Снапкоў.

— Развіццё Кітая вызначаецца магутным унутраным драйверам і гістарычнай логікай, — адзначыў першы віцэ-прэм'ер. — Паспяхова дасягнута першая мэта стагоддзя: за мінулае дзесяцігоддзе падвоіўся ВУП, доля Кітая ў глабальнай эканоміцы дасягнула адной пятай. Хачу адзначыць яшчэ адно дасягненне, якое звычайна не агучваюць. КНР апярэдзіў ЗША і стаў першай краінай у свеце па колькасці зарэгістраваных патэнтаў. Гэта сведчанне магутнага тэхналагічнага лідарства. Як справядліва адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, з моцным Кітаем будзе моцнай Беларусь.

Кітай паспяхова рухаецца да другой мэты стагоддзя — пабудове ўсебакова мадэрнізаванай сацыялістычнай дзяржавы. Гэтае свята Кітайская Народная Рэспубліка адзначае як моцная дзяржава, якая ўносіць важкі ўклад у забеспячэнне міру, стабільнасці і прагрэсу на планеце. Само свята сімвалізуе адзінства народа і моц Кітая, гонар за яго тысячагадовую гісторыю, багатую культуру і традыцыі.

Як заўважыў Мікалай Снапкоў, «Беларусь цалкам падтрымлівае рэалізацыю кітайскай ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» і трох адзінай канцэпцыі Ініцыятыў глабальнай бяспекі, развіцця і цывілізацыі».

— Год таму Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка і Старшыня КНР Сі Цзіньпін прынялі рашэнне аб новай эпосе ў міждзяржаўных адносінах — усталяванні ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства, — адзначыў першы віцэ-прэм'ер. — Гістарычнае рашэнне паслужыла магутным штуршком для паглыблення поўнамаштабнага і шматвектарнага супрацоўніцтва дзвюх краін. Як адзначыў Старшыня КНР 1 сакавіка на сустрэчы з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, «новы статус двухбаковых адносін павінен напаўняцца новым зместам».

Як падкрэсліў Мікалай Снапкоў, у рамках дзяржаўнага візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай лідары дзвюх краін надалі імпульс стратэгіі сумеснага тэхналагічнага развіцця: «Гэта аснова паступальнага эканамічнага развіцця і эканамічнай бяспекі нашай краіны ва ўмовах санкцыйнага ціску. Фактычна створана новая мадэль эканамічнага ўзаемадзеяння, забяспечаны выхад на якасна новы ўзровень партнёрства, укаранёны новыя формы і механізмы міжгаліновага супрацоўніцтва».

Першы віцэ-прэм'ер пажадаў дружалюбнаму народу Кітая новых здзяйсненняў і перамог і каб адзінства і патрыятызм заўсёды былі надзейнай апорай, а адносіны ўсепагоднай дружбы і жалезнага братэрства паміж Рэспублікай Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікай і надалей развіваліся і мацнелі.

Павіншаваць кітайскіх сяброў з іх галоўным дзяржаўным святам таксама прыйшлі высокія госці, сярод якіх — першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Максім Рыжанкоў, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Валерый Міцкевіч, члены ўрада, кіраўнікі ўстаноў і ведамстваў, прадпрыемстваў, дыпламаты, журналісты. Пасольства падрыхтавала цудоўную культурную праграму — у зале гучала кітайская музыка, гасцям паказалі нацыянальныя танцы.

«Вельмі важна усталёўваць масты дружбы, — заўважыў Се Сяаюн. — Прыемна, што «Звязда» актыўна далучаецца да ўмацавання і пашырэння кітайска-беларускіх узаемаадносін. Усё тое, што вы робіце, спрые развіццю нашага супрацоўніцтва».

Далёкія па адлегласці, але блізкія па духу, Мінск і Пекін насамрэч сталі яшчэ бліжэй.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**





**З нагоды**

## Усепагодная дружба і жалезнае братэрства

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Старшыню Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіна з Днём абвяшчэння КНР, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«Пад Вашым мудрым кіраўніцтвам Кітай эфектыўна рухаецца па шляху пабудовы новай мадэлі міжнародных адносін і глабальнага кіравання, заснаванай на ўзаемнай павазе, справядлівасці і супрацоўніцтве, — адзначаецца ў віншаванні. — Ваша краіна дасягае выбітных поспехаў у стварэнні ўсебакова мадэрнізаванай сацыялістычнай дзяржавы, трымаючыся курсу бесперапыннага развіцця і прагрэсу».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што стратэгічнае партнёрства Беларусі і Кітая дынамічна і плённа развіваецца ў духу ўсепагоднай дружбы і жалезнага братэрства і прыносіць важкія вынікі. «Перакананы, што ўсе дасягнутыя намі дамоўленасці атрымаюць практычнае ўвасабленне, будуць спрыяць прымнажэнню пазітыўнага вопыту ўзаемадзеяння і павышэнню дабрабыту нашых народаў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў Сі Цзіньпіну добрага здароўя, поспехаў і невычэрпных сіл для вырашэння гістарычных задач, а дружалюбнаму народу Кітая — дабрабыту, міру і працвітання.

Можа спатрэбіцца

# ПАДЗЕЛ НЕРУХОМАСЦІ І... ІНСТАГРАМ-АКАЎНТА

## Што можна, а што не ўказваць у шлюбным дагаворы, расказалі юрысты

**Задача натарыуса — прадухіліць спрэчкі, у тым ліку маёмасныя, якія могуць узнікнуць нават у самай шчаслівай сям'і і паміж самымі закаханымі людзьмі. Жыццё — рэч непрадказальная, таму варта ўсё ж мець у запасе шлюбны дагавор, раяць юрысты. Ды і самі сужэнцы ўсё часцей хочуць складаць такі дакумент, дзе можна прапісаць усё, што заўгодна, ну, ці амаль усё... Здараецца, у дагавор людзі хочуць уключыць такія моманты, што і натарыусу патрэбная дапамога... адваката. Пра некаторыя акалічнасці магчымага вырашэння розных сітуацый, вядомых з практыкі, расказалі спецыялісты.**

### КАБ УСЁ АТРЫМАЎ АДЗІН, НЕЛЬГА, АЛЕ... МАГЧЫМА

Штогод у Беларусі заключаецца 4-4,5 тысячы шлюбных дагавораў (ШД), галоўным пунктам у якіх найчасцей становіцца нерухомасць, сумесна нажытая ў шлюбе. Аднак прадметам дагавора можа быць і транспартны сродак, правы на інтэлектуальную ўласнасць, нават ільготныя крэдыты на набыццё маёмасці для шматдзетных сямей, абазначыла **Наталля БАРЫСЕНКА, старшыня Беларускай натарыяльнай палаты**:

— Шлюбны дагавор — дакладна зразумелыя абавязкі сужэнцаў, якія абазначаны пры наступленні пэўных умоў. Пары заключаць яго яшчэ да шлюбу ці ўжо жанатыя. Пры з'яўленні дзяцей такая прававая канструкцыя дазваляе акрэсліць максімальна шырокае кола праваадносін, у тым ліку па ўтрыманні і выхаванні дзяцей, нават пасля скасавання шлюбу.

Умовы шлюбнага дагавора не могуць супярэчыць заканадаўству, не могуць абмяжоўваць правы і здольнасці сужэнцаў, у тым ліку іх права на судовую абарону, расказала **Лідзія ГРЭКАВА, натарыус Гомельскай натарыяльнай акругі.**

— Наяўнасць у шлюбным дагаворы ўмоў па перадачы ўласнасці, якая нажытая агульна, толькі аднаму з сужэнцаў не вядзе да прызнання дагавора нядзейсным. Натарыус сведчыць такую здзелку і праводзіць яе прававую ацэнку: правярае змест умоў шлюбнага дагавора на адпаведнасць заканадаўству, правярае прыналежнасць маёмасці і дзяржрэгістрацыю, наяўнасць абмежаванняў і абцяжаранняў, якія маглі б перашкаджаць здзяйсненню здзелкі, а таксама іншыя акалічнасці, неабходныя для сведчання здзелкі.

Натарыус будзе раіць, каб быў нейкі баланс у маёмасных справах мужа і жонкі, аднак калі сужэнцы дамовіліся паміж сабой і настойваюць менавіта на такім падзеле, то такую здзелку па складанні ШД менавіта такога зместу натарыусы завераць, бо гэта найперш пагадненне асоб, а не юрыстаў. Задача апошніх — зрабіць так, каб дакумент адпавядаў заканадаўству і не парушаў яго.

### ПІСЬМОВАЯ ЗГОДА І ВЫСЯЛЕННЕ... У МЕЖАХ НАСЕЛЕНАГА ПУНКТА

Часта задаюць пытанне, ці можна ўключыць ва ўмовы дагавора пункт аб тым, што распараджэнне рухомай маёмасцю магчымае з пісьмовай згоды другога сужэнца, расказала Лідзія Грэкава:

— Згодна з законам, сужэнцы маюць роўныя правы па распараджэнні, карыстанні сумесна нажытай маёмасці, калі іншае не прадугледжана шлюбным дагаворам. Таму пункт пра тое, што муж і жонка будуць распараджацца не толькі нерухомай, але і рухомай маёмасцю (са згоды адно аднаго) будзе адпавядаць патрабаванням закона і можа быць уключаны ў ШД.

У шлюбным дагаворы можна таксама прапісаць умовы аб высяленні з жылых памяшканняў. Згодна з Жыллёвым кодэксам, у шлюбным дагаворы можна замацаваць абавязак сужэнцаў пакінуць жылое памяшканне або захаваць за сабой права ўладання і карыстання ім. Гэтыя пытанні рэгулююцца пагадненнем бакоў і па іх жаданні ўносяцца ў шлюбны дагавор, абазначыла натарыус:

— Аднак ёсць некаторыя абмежаванні. Напрыклад, высяленне з жылля, якое набыта з дзяржпадтрымкай, магчымае толькі ў межах населенага пункта ў жыллё, якое належыць асобе, якая высяляе члена (або былога члена) сям'і або належыць асобе, якую намервающа выселіць з памяшкання. Калі сужэнцы хочуць уключыць такія палажэнні ў шлюбны дагавор, мы тлумачым ім умовы, прадугледжаныя ў заканадаўстве, каб яны разумелі, ці магчыма гэта будзе рэалізаваць на практыцы.

### ПРАВА НА ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫЯ ЗДАБЫТКІ: АГУЛЬНЫЯ І АСАБІСТЫЯ

З развіццём новых тэхналогій з'яўляюцца і новыя сферы, якія сужэнцы хочуць адлюстраваць у ШД. Напрыклад, падзел інстаграм-акаўнта, нажытага ў перыяд шлюбу. Падобнай практыкі ў Беларусі пакуль не існуе.

— Найперш увогуле трэба вызначыць, якой формай маёмасці з'яўляецца інстаграм-акаўнт. Мяркую, што гэта ўсё ж аб'ект інтэлектуальнага права. У Расійскай Федэрацыі, у прыватнасці, існуе норма прамога дзеяння (у сямейным кодэксе Расіі), згодна з якім выключнае права на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці, якія створаны адным з сужэнцаў, належыць аўтару такіх вынікаў. То-бок расійскае заканадаўства вызначае такі здабытак выключна як асабістую маёмасць сужэнцаў, — заўважыла **адвакат Мінскай гарадской калегіі адвакатаў Вольга ЧАЙКІНА.**

У пастанове пленума па справах аб наследаванні Вярхоўнага Суда РФ гэты пастулат знайшоў адлюстраванне і больш шырокую інтэрпрэтацыю. У прыватнасці, сказана, што «выключнае права на выніці інтэлектуальнай дзейнасці, створаныя адным з сужэнцаў, не ўваходзіць у агульную маёмасць сужэнцаў. Выключнае права на выніці інтэлектуальнай дзейнасці, набытае за кошт агульных даходаў сужэнцаў па дагаворах аб адчужэнні такога права, з'яўляецца іх агульнай маёмасцю», дадала Вольга Чайкіна:

— Заканадаўца дае зразумець, што калі інстаграм-акаўнт быў набыты за кошт сумесна нажытых грашовых сродкаў, то даходы, якія прыносіць акаўнт (калі ў ім змяшчаецца рэклама, маецца шмат падпісчыкаў) і якія можна манетызаваць (па аналогіі з інтэлектуальным правам), з'яўляюцца сумеснай уласнасцю. Калі ж інстаграм створаны адным з сужэнцаў, які яго вядзе, і нават у рэкламу акаўнта не ўкладвае грошы з сумесна нажытых сродкаў, такі акаўнт лічыцца асабістай маёмасцю аднаго з сужэнцаў, і даходы ад яго — таксама.

Тым не менш для Беларусі гэта яшчэ спрэчнае пытанне, ці з'яўляецца інстаграм-акаўнт інтэлектуальнай уласнасцю. І калі сужэнцы хочуць уключыць такі рэсурс у ШД, то перашкод для гэтага няма. У практыцы беларускіх адвакатаў быў выпадак, які датычыўся даменнага імя. Адміністратар дамена (муж) замацаваў за сабой права на гэтае даменнае імя, і ў шлюбным дагаворы прапісалі, што ўсе здабыткі, якія будуць звязаны, напрыклад, з адчужэннем даменнага імя, будуць належаць гэтаму сужэнцу. Падобнае рашэнне можна, пэўна, прапанаваць і адносна інстаграм-акаўнта.

**Ірына СІДАРОК.**

Падзея

# У КАРЭЛІЧАХ — КНІЖНАЕ СВЯТА

**Традыцыяй стала правядзенне на Гродзеншчыне міжрэгіянальнага фестывалю «ПРОдвижение КНИГИ. Библиотечные ступени». Адрас — гарадскі пасёлак Карэлічы. Сёлета кніжнае свята, арганізаванае калектывам Карэліцкай раённай бібліятэкі, было прысвечана Году міру і стваральнай працы.**

У праграме фестывалю, удзел у якім прынялі Навагрудская, Воранаўская, Нясвіжская і Ляхавіцкая раённыя бібліятэкі, было нямала мерапрыемстваў, скіраваных на прапаганду кнігі, на разгляд розных бібліятэчных навацый. Дарэчы, у фармаце анлайн у свяце прыняла ўдзел і Уздзенская раённая бібліятэка. Перш-наперш былі прэзентаваны бібліятэчныя пляцоўкі: «Бібліятэка як брэнд», «Прасоўванне бібліятэкі ў сацыяльных сетках», «База даных уласнай генерацыі». Падчас работы фестывалю праходзіў продаж кніг беларускіх кніжных і медыйных выдавецтваў. Шкада, што на свяце іх было ўсяго толькі тры: Выдавецкі дом «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літаратура» і рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Адукацыя і выхаванне», апошняе з якіх пазнаёміла не толькі з папулярнымі асветніцкімі выданнямі, але і прадставіла часопіс «Рюкзачок», які добра знаёмы школьнікам нашай краіны. Магчыма, з часам да кніжнага свята ў знакамітым, багатым на гісторыю рэгіёне далучацца і іншыя дзяржаўныя і прыватныя выдавецтвы. Будзем на гэта спадзявацца!..



**Віктар ШНІП і Кацярына ХАДАСЕВІЧ–ЛІСАВАЯ.**

У СШ № 1 г. п. Карэлічы прайшла сустрэча са старшынёю Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі паэтэсай і празаікам Людмілай Кебіч, якая прадставіла вучням і настаўнікам сваю новую кнігу прозы «Жыццёвыя путы», зборнік пабачыў свет у Выдавецкім доме «Звязда». Удзел у сустрэчы прыняў і добра вядомы на Гродзеншчыне паэт Мікалай Іваноўскі. Яшчэ на фестывалі была прэзентавана кніга мясцовага краязнаўца Святланы Кошур «Праз пацiну часу», якая толькі што прыйшла з друкарні. Дарэчы, некалькі дзён назад гэтае выданне, што таксама выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда, было прэзентавана ў Навагрудскай раённай бібліятэцы. Пад адной вокладкай член Саюза пісьменнікаў Беларусі Святлана Кошур сабрала свае краязнаўчыя нарысы, якія распавядаюць пра людзей і мясціны Навагрудчыны, Карэліччыны, пра розныя гістарычныя адрэзкі часу.

Кацярына Хадасевіч-Лісавая, аўтар болей як дзясятка кніг пра Вухуціка і іншых не меней знакамітых герояў, упадабаных дзіцячым чытачом, таксама наведалася ў Карэлічы. Пісьменніца прэзентавала свае новыя кнігі, якія сістэмна, з году ў год, выходзяць у Выдавецкім доме «Звязда». Кацярына Хадасевіч-Лісавая расказала гаспадарам фестывалю і яго гасцям з розных куткоў Гродзеншчыны, Міншчыны і Берасцейшчыны і пра свае новыя творчыя планы. Застаецца толькі сачыць за навінкамі, што неўзабаве пабачаць свет. Яшчэ адзін аўтар Выдавецкага дома «Звязда», прадстаўляючы свае кнігі, займеў шырокую чытацкую ўвагу, — размова пра Дзмітрыя Нікалаева. Сустрэча з ім на фестывалі сабрала нямала прыхільнікаў творчасці дзіцячага пісьменніка. Пра свае новыя кнігі, што выйшлі ў Выдавецкім доме «Звязда», расказаў чытачам і вядомы паэт і празаік, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура», галоўны рэдактар часопіса «Полымя», старшыня секцыі паэзіі Саюза пісьменнікаў Беларусі Віктар Шніп. «Кастусь і Міёна», «Заўтра была адліга — 3», «Васільковаы мёд» — назвы толькі некаторых з іх.

Сёлета вельмі шмат розных кніжных фестываляў альбо форумаў, дзе прапаганда кнігі, чытання займала пачэснае месца, прайшло і ў Мінску, і ў іншых гарадах краіны. Карэлічы са сваім творчым, багатым на адкрыцці праектам займаюць пачэснае месца ў шэрагу «кніжных адрасоў» Беларусі. Калектыў Карэліцкай раённай бібліятэкі на чале са сваім кіраўніком Ліліяй Арцюх робіць дзеля гэтага неверагодна шмат.

**Раман СЭРВАЧ.**


**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона)
по поручению открытого акционерного общества «Добрушский комбинат бытового обслуживания» (продавец)
извещает о проведении 11 октября 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 45 %
по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение с инв. № 311/D-11543** общей площадью **2 614,50 кв. м,** назначение – помещение бытового обслуживания населения, наименование – **помещение**. Расположено: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. князя Паскевича, 12-1, земельный участок с кадастровым номером **321250100001002823** общей площадью **0,1900 га (право аренды).** **Ограничение (обременение):** договоры аренды (39 шт.) сроком действия до 2023–2025 гг., площадь, сданная в аренду, – **825,01 кв. м** | **123 750,00** | 12 375,00 |

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.** Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) и заключение договора купли-продажи осуществляются по контактному тел. **8 (025) 628-01-39, Лычковская Ирина Александровна.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет Продавца торгов **(ОАО «Добрушский комбинат бытового обслуживания»):** BY36AKBB30121778090633000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 400003508, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса».

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 2 октября 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 9 октября 2023 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. В случае если аукцион признан несостоявшимся, в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение 3 (трех) рабочих дней с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение 3 (трех) рабочих дней с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней от даты подписания протокола о результатах аукциона, оплатить приобретаемое имущество Продавцу в течение **10 (десяти) рабочих дней** после подписания договора купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 26.01.2023 г. № 16 (29896).**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – **www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**

# ІМУНІТЭТ У ТАЛЕРЦЫ: РЫХТУЕМСЯ ДА СЕЗОНА ВІРУСАЎ

**Эпідэміёлагі гавораць, што ў гэтым халодным сезоне свет атакуе цэлы шэраг каранавірусных штамаў, у тым ліку новыя «Эрыс» і «Пірола». Ды і акрамя «кароны» нас чакае сустрэча з шырокім спектрам вірусаў, як, зрэшты, і кожную восень і зіму. Як падтрымаць імунітэт напярэдадні сезона праcтуд — ці рэальна гэта зрабіць толькі з дапамогай правільнага харчавання? І што павінна быць у талерцы чалавека, якому няма калі хварэць? Пра гэта мы спыталі ўрача-дыетолага, клінічнага ардынатара кафедры медыцынскай рэабілітацыі і фізіятэрапіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Марыі ЛІТВІНАВАЙ.**



## АБ ВІТАМІНАХ І ДЫЕЦЕ

***— Марыя Пятроўна, ці можна толькі з дапамогай правільна арганізаванага харчавання сапраўды ўмацаваць імунітэт?***

— Правільнае харчаванне — толькі адзін са складнікаў комплекснага падыходу да здароўя і моцнага імунітэту. Яно адыгрывае вялікую ролю, але таксама ў жыцці павінны прысутнічаць фізічная актыўнасць, здаровы рэжым працы і адпачынку, тайм- і стрэс-менеджмент. Усе гэтыя складнікі эфектыўныя толькі ў комплексе. Такім чынам, арганізацыя харчавання не панацэя. Але гэта адна з найважнейшых умоў моцнага імунітэту.

***— Зразумела, што пачынаць умацоўваць імунітэт ніколі не позна. Але колькі спатрэбіцца часу для дасягнення адчувальнага эфекту?***

— Цяпер восень, і на фоне змены надвор'я мы бачым усплёск віруснай актыўнасці пасля лета: людзі пачалі хварэць на ВРВІ. Асабліва тыя, хто з'ездзіў на мора і напружыў свой імунітэт: у паўднёвых краінах сонца больш агрэсіўнае, чым тое, да якога прывыклі ўраджэнцы сярэдняй паласы, і гэта спрыяе зніжэнню супраціўляльнасці вірусам. Калі мы задаліся мэтай умацаваць свой імунітэт, каб сапраўды любы вірус нам быў не страшны, то, палічыўшы цяпер, мэты мы дасягнём да наступнага восеньска-зімовага сезона. Але пачынаць усё роўна неабходна. Проста важна ўсведамляць, што гэта доўгі шлях. І лепш усё ж зрабіць першыя крокі ў зададзеным напрамку цяпер, чым зімой, калі для арганізма раптоўныя абмежаванні могуць стаць стрэсам. Пасля лета наш арганізм яшчэ не пакутуе ад дэфіцыту вітамінаў, мы спажывалі дастатковую колькасць антыаксідантаў. І першае, што я параіла б для падтрымання імуннай сістэмы з прыходам восені, — пачаць прыём прафілактычнай дозы вітаміну D. Нават улетку, як паказваюць даследаванні, узровень вітаміну D у нас дасягае ніжняй мяжы нормы. Можна, вядома, зрабіць аналіз на гэты вітамін і падабраць дозу індывідуальна, але ўніверсальная рэкамендацыя — 2000 адзінак для жанчын і 4000 — для мужчын. Не звяртаючы ўвагі на гэтую рэкамендацыю, паступова, па меры пахаладання і скарачэння сонечных дзён, мы будзем спускацца ў дэфіцыт вітаміну D, і гэта негатыўна паўплывае і на імунітэт, і на абменныя працэсы, і на настрой. Калі казаць пра іншыя вітаміны, то патрэба ў іх у нашым арганізме ў значнай ступені мае сезонны характар. Летам яна вышэйшая, а да пачатку восені зніжаецца, таму што фізіялагічна чалавек адаптуецца да тых умоў, у якіх жыве.

Да зімы мы традыцыйна набіраем вагу. Плюс 2-3 кілаграмы — норма, не трэба гэтага баяцца. І яшчэ адна, на мой погляд, важная рэкамендацыя, калі казаць аб узаемасувязі імунітэту і сілкавання ў восеньска-зімовым сезоне. Не трэба садзіцца на дыету да Новага года і ўганяць свой арганізм у стрэс. Узімку непазбежна нас чакаюць усплёскі вірусных інфекцый, і, недаядаючы, мы недаатрымліваем бялок, неабходны імуннай сістэме, змяншаем узровень макра- і мікраэлементаў. Увосень і ўзімку асабліва важна, каб сілкаванне было збалансаванае, без пакутлівых дыет.

## АБ ШКОДНЫХ ПРЫСМАКАХ І СТАТУСЕ ЕЖЫ

***— Давайце пойдзем «ад адваротнага»: якія прадукты разбураюць наш імунітэт?***

— У цэлым незбалансаванае харчаванне. Хоць, паўтаруся, не трэба рабіць з харчавання панацэю. Калі чалавек займаецца спортам, мае любімую працу, калі ў яго парадак у асабістым жыцці і пераважна добры настрой, плюс, зразумела, здаровае харчаванне, у яго будзе моцны імунітэт. Узімку зніжаецца колькасць сонечнага святла і, як вынік, падае ўзровень серsucceeded — і нас пачынае цягнуць на вугляводы. Ёсць такі тэрмін у псіхалогіі — сіндром зімовай дэпрэсіі, адзін з сімптомаў якога — цяга да мучнога і салодкага. Але гэта не тая якасць калорый, якая нам неабходна для імунітэту. Такім чынам, чалавек павялічвае цукар у крыві, прыўносіць у свой арганізм непатрэбны, некарысны тлушч, і гэта негатыўна адбіваецца на стане сардэчна-сасудзістай сістэмы. А калі мы кажам пра каранавірусную інфекцыю, то, ужываючы вялікую колькасць салодкіх прысмакаў напярэдадні і падчас хваробы, рызыкуем атрымаць цяжкае цячэнне ковіду і наступных ускладненняў. Заўважу, што чалавек з моцным імунітэтам, сутыкнуўшыся з любым вірусам, мае «змазаныя» сімптомы — у асноўным гэта павышэнне тэмпературы. З'яўляецца ўвесь «букет» — насмарк, боль у горле, кашаль, ламота ў касцях і г. д.? Значыць, наша імунная сістэма не спраўляецца і вірус мацнейшы за нас. Калі рабіць усё паэтапна і рэгулярна — правільнае харчаванне, загартоўванне, фізічная актыўнасць, пазітыўны настрой — мы выходзім з любых вірусных захворванняў хутка і без ускладненняў.

***— Такім чынам, цукар, асабліва ў спалучэнні з тлушчам, то-бок кандытарскія вырабы і, зразумела, фастфуд — ворагі імунітэту...***

— Гэта тое, што зніжае імунітэт. Хоць калі вы спартсмен і пасля трэніроўкі з'елі нешта з гэтага спіса, вялікай шкоды арганізму не нанесяце. Іншая справа — сярэднестатыстычны сучасны гараджанін. Яго звычайныя праблемы — нізкая фізічная актыўнасць, неарганізаванасць распарадку дня, гаджэты да позняй ночы, недахоп сну. Дарэчы, блакітнае святло экрана (тэлевізар, ноўтбук, смартфон) зніжае мелатанін — гармон сну. У выніку мы атрымліваем бяссонніцу. І, як вынік, на працягу дня стымулюем сябе кавай і прысмакамі, падрываючы імунітэт.

***— Кава таксама негатыўна ўплывае на імунную сістэму?***

— Яна, хутчэй, аказвае не прамы, а апасродкаваны негатыўны ўплыў. Па-першае, як «нагода» для салодкага. А па-другое, кава нясе функцыю псіхастымуляцыі. Не выконваючы правілы здаровага харчавання ў прыватнасці і здаровага жыцця ў цэлым, чалавек пры дапамозе кавы павышае картызол і дафамін, каб штучна падняць настрой і працаздольнасць. Хуткае зніжэнне дафаміну спрыяе фарміраванню залежнасці і цягі да чарговага кубачка «задавальнення», арганізм прывыкае да кавава-дэсертнага допінгу... Так мы падсілкоўваем сябе на працягу дня, увечары шчыльна вячэраем, таму што арганізм недабраў за дзень карысных рэчываў, да позняй ночы глядзім серыял або гартаем стужку ў сацсетках, і назаўтра ўсё паўтараецца.

***— Як вырвацца з гэтага кола?***

— Выкарыстоўваючы прынцып дазавання і паступовасці. Паступова скарачаючы колькасць шкодных прадуктаў у сваім рацыёне і замяняючы іх на карысныя. А калі ўзнікае пытанне, дзе ўзяць матывацыю, для пачатку проста распішыце ўвечары ў блакноце свой дзень з пункту гледжання таго, што вы елі. Цалкам магчыма, вы жахняцеся таму, якім «палівам» запраўляеце свой арганізм. На сваіх лекцыях я кажу, што ў сучаснага чалавека на працягу дня звычайна толькі 1-2 % усвядомленых дзеянняў, а ў асноўным — стэрэатыпныя паводзіны, рух па ўсталяваным распарадку і выкананне звыклых рытуалаў. Між тым свядомасць дапаможа вам задацца пытаннем: каго мы кормім, калі складаем свой прадуктовы кошык? Свой арганізм, падтрымліваючы яго здароўе? А можа быць, мы кормім маркетолагаў, рэкламшчыкаў, вытворцаў фастфуду? Убачылі па дарозе білборд з гамбургерам, і вось ужо наша падсвядомасць падштурхоўвае нас зайсці ў рэстаран фастфуду. Зноў жа, далікатэсы... Чым вышэйшы статус ежы, тым у большай ступені яна дорыць адчуванне статуснасці. Насамрэч нам не патрэбныя, напрыклад, вустрыцы. Зразумела, што яны змяшчаюць важныя амінакіслоты. Але гэтыя рэчывы можна атрымаць, дапусцім, з ялавічнага ці свінога рубца. Я, дарэчы, часта ўключаю ў меню сваёй сям'і субпрадукты — яны вельмі карысныя. Традыцыйны ў нашай культуры харчавання халадзец дае арганізму калаген, а гэта і прыгожая скура, і добрыя валасы. Бялок атрымліваем з яек і тварагу. Хочацца мучнога? Спячыце хатні пірог — са слівамі або яблыкамі. Вы будзеце дакладна ведаць, колькі там цукру (які можна замяніць мёдам або карыснымі падсаладжвальнікамі), будзеце ўпэўнены, што там няма ні транстлушчаў, ні кансервантаў. Замест малочнага шакаладу ўжывайце горкі, там мала цукру, а карысных рэчываў шмат. І паступова нашы смакавыя рэцэптары прывыкнуць да правільных смакаў.

***— Лішак солі таксама негатыўна ўплывае на імунітэт?***

— У першую чаргу ён уносіць карэктывы ў работу сардэчна-сасудзістай сістэмы. Кроў чалавека павінна мець пэўныя суадносіны натрыю і калію. Калі натрый у лішку, вадкасць сыходзіць у тканкі, з'яўляюцца ацёкі, нагружаецца сэрца, пакутуюць печань і ныркі. Мэтазгодна скараціць колькасць солі ў рацыёне, а дасольваць ежу ёдаванай або марской соллю: так мы папоўнім недахоп ёду, які таксама дрэнна адбіваецца на імунітэце.

## АБ КАРЫСНЫХ ПРАДУКТАХ І НЕАБХОДНЫХ НАМАГАННЯХ

***— А якія прадукты абавязкова ўсё ж у меню з надыходам халоднага сезона, каб падтрымаць імунітэт?***

— Гэта, напрыклад сухафрукты. Памяншаючы долю кандытарскіх вырабаў, мы пераходзім менавіта на іх у якасці дэсерту. І тут дарэчы будзе пагаварыць аб суперфудах. Прынята лічыць, што пад гэтым словам хаваюцца нейкія заморскія прадукты, але насамрэч я кажу пра нашы, спрадвечныя. Напрыклад, мочаныя яблыкі — вельмі карысны ферментаваны прадукт. Да таго ж ён не ўдарыць па бюджэце. Засаліце агуркі, паквасьце капусту. Уключыце ўсё гэта ў рацыён, і ваш імунітэт скажа вам «дзякуй». Камбуча, яна ж «чайны грыб», — таксама ферментаваны прадукт і магутны сродак для падтрымлівання імунітэту.

У значнай ступені наш імунітэт залежыць ад правільнай работы кішэчніка. Таму ў рацыён у «вірусны сезон» асабліва важна дадаць прабіётыкі і прэбіётыкі. Першыя атрымліваем з кісламалочных і ферментаваных прадуктаў, другія — з клятчаткі. Узімку яе прасцей за ўсё атрымаць са свежай і квашанай капусты, брокалі і зеляніны. Усё гэта — нашы традыцыйныя стравы, і яны нам неабходны. Акрамя таго, уключэнне іх у рацыён апраўдана ў тым ліку і з эканамічнага пункту гледжання.

***— Мужчынам і жанчынам патрэбны розныя прадукты для падтрымання імунітэту?***

— У ідэале, вядома, работу па ўмацаванні імунітэту я раіла б пачынаць з аналізаў. Кожны арганізм індывідуальны, і меню кожнаму з нас патрэбна сваё. Калі даваць універсальныя рэкамендацыі, то гарманальна жанчыны ў большай ступені абаронены ад вірусных захворванняў. Насамрэч менавіта жанчыны — моцны пол, у іх мацнейшы імунітэт, яны, пакуль не прыйдзе менапаўза, больш устойлівыя да розных інфекцый. Акрамя таго, мужчыны ў нашай культурнай традыцыі часцей займаюць кіруючыя пасады, у іх больш стрэсавых фактараў. Плюс ім трэба падтрымліваць мышачную сістэму. Таму ім у большай ступені неабходна бялковае харчаванне — гэта значыць, рабіць упор на бялкі пры скарачэнні жывёльных тлушчаў. Але ў цэлым прынцыпы здаровага харчавання аднолькавыя для ўсіх. Калісьці людзі ў паўсядзённым жыцці расходавалі вялікую колькасць калорый, так што свініна з бульбай ім не шкодзіла. У сучасных рэаліях для здароўя нам неабходна не больш за два жывёльныя прадукты ў дзень. То-бок калі выпілі капучына (з малаком), то яшчэ сёння можна з бялковых прадуктаў толькі 150—200 г курыцы. На сняданак лепш абраць карысныя вугляводы — напрыклад, кашу (не хуткага прыгатавання) з арэхамі або сухафруктамі. Не спалучаем вугляводы з насычанымі жывёльнымі тлушчамі. Такім чынам, бульба са свінінай — гэта дрэнна, а з селядцом — добра. Абавязкова ўключаем у рацыён поліненасычаныя тлустыя кіслоты. Выдатна падыдзе рапсавы алей халоднага адціскання. Я раю такую салатную сумесь: 20 г рапсавага алею, 10 г сланечнікавага, 10 г гарбузовага. Запраўце салату, і арганізм атрымае поўны спектр амега-кіслот — 3, 6, 9. Спажываем не менш за 400 г гароднiны і садавіны ў дзень. Перад сном можна з'есці 30 г сыру, ён багаты трыптафанам, гэта папярэднік серататаніну, гармону радасці і гармону сну мелатаніну для здаровага сну. Скарачаем «зносіны» з гаджэтамі, перад сном чытаем дзецям казкі (а не ставім мульцік), у выхадныя едзем сям'ёй на прыроду не «на шашлыкі», а на велапрагулку або лыжную прабежку, атрымліваем пазітыўныя эмоцыі без сварак і лаянкі. Гэта рэцэпт і моцнага імунітэту, і ў цэлым шчаслівага і доўгага жыцця. На двары XXI стагоддзе, медыцына навучылася прафілактаваць многія хваробы. Але на этапе прафілактыкі здароўе чалавека — гэта адказнасць кожнага. Урач не будзе гатаваць вам правільную ежу і не стане прымушаць вас дастаткова рухацца. Сучасная медыцына дае вам інструмент. А далей трэба зрабіць над сабой намаганне. І тады ўзнагародай за працу і самадысцыпліну стане высокі імунітэт, моцнае здароўе і выдатны настрой.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## Алена СПІРЫДОВІЧ:

# «У ЖЫЦЦІ ГАЛОЎНАЕ — ПАСПЕЦЬ СКАРЫСТАЦЦА ЧАСАМ»

**Многія з нас ведаюць яе па інтанацыях голасу, усмешцы, вобразах, якія не раз бачылі на экранах сваіх тэлевізараў ці сцэнічных пляцоўках... А калегі характарызуюць гэтую вядучую як прафесіянала, роўных якому няма. Сама ж Алена Спірыдовіч тлумачыць свой поспех проста: «Займаюся любімай справай усё жыццё». Пра тое, чым вызначаецца якасць праекта на тэлебачанні, ці магчыма пераняць сакрэт чужога поспеху і як не выгарэць у няспынным руху, распыталі ў тэлевядучай пры сустрэчы.**

***— Алена, вы ўжо 40 гадоў працуеце на тэлебачанні і 32 гады — на фестывалі «Славянскі базар». Што сёння дапамагае вам адчуваць сваю папулярнасць?***

— Я заўжды вельмі многа працавала. Помню, калі толькі прыйшла на тэлебачанне, мы з камандай пачалі займацца першым у Беларусі вялікім конкурсам «Зорная ростань». Прычым не надта верылі, што на кастынг да нас даедуць людзі, таму самі ездзілі па абласных цэнтрах і там ладзілі адбор. І так атрымлівалася, што больш чым два тыдні ў месяц я была ў камандзіроўках. Што датычыцца вопыту, то чым больш працуеш, тым больш складанымі табе здаюцца многія простыя рэчы. Разумееш, што за знешняй прастатой (канцэртныя ці тэлевізійныя гэта праекты) могуць хавацца падводныя цячэнні і камяні. Таму я вельмі баюся фразы, калі прыходзіш весці канцэрт: «У нас Спірыдовіч — значыць, усё будзе добра!». А мне трэба шмат рэпеціраваць, я люблю задаваць у працэсе шмат пытанняў, бо, толькі расставіўшы ўсё для сябе па месцах, магу часова супакоіцца. А збоку здаецца, што ў нас, вядучых, гламурная праца, дзе мы спім да 12 гадзін дня, пасля ідзём да стыліста, робім прычоску, макіяж, а там паздымаліся недзе — і зноў можам адпачываць. Можа, так і павінна быць, каб людзям здавалася, што табе лёгка. Толькі не заўсёды так бывае.

***— А што думаеце пра маладое пакаленне калег?***

— Думаю, што тыя, хто абірае такі шлях, — шчаслівыя людзі. Ім здаецца, быццам усё проста. І няхай так думаюць, бо свае гузакі яшчэ паспеюць набіць і да іх прыйдзе вопыт. Маладых я ацэньваю не з пазіцыі крытыка, а як чалавек, які нечаму ў іх вучыцца і разумее, калі бачыць іх памылкі, што і сам некалі такія рабіў, потым перастаў — значыць, і яны перастануць. Мне ў гэтым сэнсе вельмі падабаецца ўсходняе выслоўе — «няхай кветак будзе шмат, і няхай усе яны квітнеюць».

***— Пры ўсёй вашай пазнавальнасці вас не знойдзеш у сацыяльных сетках...***

— Я проста за жывыя сустрэчы. Няхай зносін будзе менш, але яны будуць менавіта ў такім фармаце, калі можна проста спыніцца, запаволіцца і адчуць асалоду ад таго, што пражываеш тут і цяпер.

***— Да чаго абавязвае вас публічны бок прафесіі? І што застаецца за кадрам?***

— Мяне пазнаюць без макіяжу і без канцэртнай сукенкі, таму я заўсёды гатовая да сустрэчы са сваім гледачом, хоць і не ведаю, калі яна адбудзецца. Бывае, ты можаш проста выйсці ў краму, а там да цябе звернецца незнаёмы чалавек. І вось такая гатоўнасць у любы момант кантактаваць з кімсьці не заўсёды лёгка даецца, але ж я сама абрала такую прафесію, таму павінна адпавядаць. Я займаюся любімай справай, і ўсё роўна наперадзе мяне ідзе ўдзячнасць усім тым людзям, якія прыходзяць на канцэрты, глядзяць праграмы, дзе я працую вядучай. Пры тым, што я толькі прадстаўляю некалькі праектаў на тым жа тэлебачанні, а ствараюць іх група таленавітых, разумных прафесіяналаў, якія аддаюць на гэта жыццё. І калі мяне пазнаюць, то я не думаю «ах, якая я цудоўная!», а радуюся, што мы з камандай зрабілі штосьці такое, што знаходзіць водгук у іншых.

***— Сёлета на «Славянскім базары» з'явілася ваша імянная валошка на Алеі зорак і вы з рук нашага Прэзідэнта атрымалі спецыяльную ўзнагароду «Праз мастацтва да міру і ўзаемаразумення». Чым знакавыя для вас такія адзнакі?***

— Я столькі гадоў вяла гэтую цырымонію і радавалася за разумных, таленавітых, прыгожых, папулярных людзей, якія атрымлівалі гэтыя ўзнагароды. Аднак ніколі не прымярала такую сітуацыю на сябе. Помню, неяк да фестывалю выдалі спецыяльную азбуку, дзе кожнай літары адпавядалі пэўныя фотаздымкі і фразы, накшталт, «кветкі — тое, што прыносяць з сабой гледачы і забіраюць пасля артысты». А вось на літару «в» там быў вядучы — «той, хто вядзе за сабой артыстаў». І менавіта так я сябе і адчуваю на «Славянскім базары». Чалавекам, якому даверана першым выйсці на сцэну. Прычым шторaз трэба зрабіць гэта так, каб той, хто з'явіцца там пасля цябе, адчуваў сябе нібы на чырвоным дыване, дзе адчуе камфорт і ўрачыстую атмасферу. А калі артыста не ведаюць, то мая задача — зрабіць усё, каб у яго ўлюбіліся пасля майго прадстаўлення. І вось у гэтым я бачу сваё прызначэнне. Словы звычайна прыходзяць патрэбныя. Але ў тым выпадку, калі думаеш не пра тое, ці пасуе табе новая сукенка і які ганарар атрымаеш пасля, а калі засяроджваешся на словах, інтанацыях, думках. У мяне неяк спыталі, чаму я не адкрываю свае курсы вядучых. А я проста не ведаю, як навучыць іншых бачыць, думаць так, як я тое раблю, апынуўшыся на сцэне. Вядома, ёсць сцэнарый і ты ведаеш яго на памяць, але разам з тым заўсёды адчуваеш і разумееш, дзе можаш яго скараціць, дзе памяняць абзацы ці правесці нейкія паралелі. Такім рэчам не навучыш.

***— Атрымліваецца, у кожнага будзе свой прафесійны рэцэпт?***

— Так, калі мы не гаворым аб пратакольных мерапрыемствах, дзе існуюць дакладныя правілы. Успамінаю, як аднойчы на такое мерапрыемства паклікалі працаваць мяне ў пары з адным артыстам. Чалавек упершыню вёў такое мерапрыемства. І вось мы пачалі аб'яўляць лаўрэатаў, і я іду па парадку, а мой калега аб'яўляе ў разнабой. За кулісамі людзі, якія ўручалі дыпломы, ледзь вытрымалі, але мерапрыемства мы правялі. А чалавек нічога не заўважыў нават. Кажа, як выдатна, і вучыць нічога не трэба — проста выйшаў і чытаеш. Таму пратаколы — асобная гісторыя. Увогуле ж, у вядучых вельмі прыемная праца — мы дорым іншым свята.



***— На тэлебачанні, вядома, іншая спецыфіка працы...***

— Так, на праграме «Беларуская часінка» я працую кожны тыдзень. І мне падабаецца, што мы кожны раз — у прамым эфіры. Там без розніцы, як ты паказаў сябе ўчора, пазаўчора, а важна, што адбываецца тут і цяпер. Плюс мы рэальна імкнёмся дапамагаць людзям. А бывае, што ў адказ ад некаторых гледачоў прыходзяць пасланні накшталт, вы далі надзею, а потым не адказалі. І тут трэба разумець, што адказаць асабіста кожнаму нерэальна, бо за час праграмы мы атрымліваем, напрыклад, сто паведамленняў, а адказаць можам толькі на дзясятак. Мне шкада, калі даводзіцца тлумачыць людзям, што яны не маюць рацыі, бо закон гаворыць аб адваротным. Тады ўжо мы не можам дапамагчы. А людзі ж заўсёды бачаць праблему так, як ім хочацца яе бачыць.

***— А публічнаму чалавеку важна весці людзей за сабой?***

— Гэта адказнасць. Я разумею, што людзі публічных прафесій для кагосьці з'яўляюцца прыкладам для пераймання. Мне важна незалежна ад абставін працаваць і сумленна выконваць сваю работу. Не магу ўявіць нават, быццам заўтра проста змяню свае погляды і стану ў шэрагі чужых мне людзей. Ведаю, што ў тым жа 2020 годзе некаторым маім калегам паступалі «цікавыя» прапановы, а да мяне, дзякаваць богу, ніхто нават не падыходзіў. Відаць, зразумелі, што са мной такое не пройдзе. Я магу падпісацца пад кожным сваім словам як сёння, так і пад тым, што гаварыла дзесяць гадоў таму. Ёсць некаторыя рэчы, якія непахісныя, як «не скрадзь», «не здрадзь» і гэтак далей. Вось нядаўна была на фестывалі ў Іўі, і там каля сабора святых Пятра і Паўла на зямлі ляжыць камень з надпісам «Любі сваю Айчыну, рабі дабро, адказвай перад Богам». І гэтыя словы, думаю, можна аднесці да ўсяго майго жыцця. Думаю, калі б так думалі ўсе мы, то многіх праблем і пытанняў проста і не ўзнікала б.

***— На тэлебачанні вас ведаюць па праектах «Беларуская часінка», «Беларуская кухня»... А нядаўна гэты шэраг папоўніўся праектам «Фактар.by 60+». Як думаеце, што вызначае доўгае жыццё праекта на тэлебачанні?***

— Калі мяне клікалі на праграму «Беларуская кухня», то спачатку я адмовілася. Па-першае, не вельмі добра гатую, а па-другое, такіх праектаў безліч на тэлебачанні. Аднак пасля я зразумела, што сутнасць «Беларускай кухні» ў тым, што яна распавядае пра нашу нематэрыяльную спадчыну. У кожнай мясцовасці ёсць жанчыны, якія атрымалі ў спадчыну ад сваіх бабуль-прабабуль сакрэты гатавання страў беларускай кухні. Прычым з тых прадуктаў, якія заўсёды былі ў іх пад рукой. А мы з шэф-кухарам Вартанам бяром гэтыя скарбы і аднаўляем на сучасный кухні, арыентуючыся на свае магчымасці па тэхніцы і прадуктах, якія ёсць у доступе. І гаспадыням, якія нас глядзяць, тлумачым, як можна з таго, што маеш, згатаваць страву, якая нагадае пра іх мінулае. Таму сакрэт доўгага жыцця ў эфіры гэтай праграмы ў тым, што яна мае правільную філасофію — не проста вучыць гатаваць, а знаёміць нас з побытам, характарам і звычкамі нашых продкаў.

***— Якія смакі вас вяртаюць у дзяцінства?***

— «Беларуская кухня» ужо 12 гадоў у эфіры, і за гэты час я згадала шмат страў, якія гатавала мая бабуля. Напрыклад, адносна нядаўна мы рабілі вельмі смачныя бліны. Зразумела, у печы яны атрымліваюцца іншыя, але ўсё ж... Гэта мучныя бліны на сыроватцы з дадаваннем тарказанай бульбы. Мая бабуля смажыла іх на сале, а пасля падавала з мачанкай са смятаны і растопленага масла.

***— Вам уменне гатаваць не перадалося?***

— Не ў такой ступені, як запэўнівае нашу аўдыторыю мой калега па праекце «Беларуская кухня». Хоць за гады існавання праграмы я многаму навучылася. Але, у адрозненне ад Вартана, які ў працэсе прыгатавання страў можа імправізаваць, я падыходжу на ролю асістэнта, які можа шмат распавесці цікавага. А паралельна, вядома, магу і морквы надзерці...

***— З гадамі ці змяняюцца вашы погляды на дружбу і каханне?***

— Сапраўдныя сябры застаюцца побач са мной па жыцці. Вельмі ўдзячная лёсу, што некаторыя людзі пакідаюць маё атачэнне і мне не даводзіцца жыць у падмане. Але адносна сяброўства я вельмі люблю паўтараць, што сапраўдны сябар — не той, хто перажывае з табой гора, а той, хто здольны тваю радасць, удачу святкаваць як сваю. Дзякуй богу, я маю такіх людзей.

***— А каханне як у трывалым сямейным саюзе мяняецца?***

— Яно не мяняецца, а жыве. Вялікае шчасце, калі мы ў жыцці маем з кім пагаварыць. І калі побач з вамі каханы мужчына, які нават без слоў здольны вам сказаць, што вы прыгожая, разумная, самая лепшая ва ўсім свеце, то больш нічога не патрэбна. І з гадамі нічога не мяняецца. Як і раней, я хвалююся, чакаю і сумую, калі мужа няма побач. Таксама сапраўднае каханне дае сілы што заўгодна перажыць разам.

***— Які каштоўны вопыт у вас застаўся ад узаемадзеяння з бацькамі па жыцці?***

— Маці, якая больш за 50 гадоў працавала на тэлебачанні, навучыла мяне працавітасці. Калі я прыйшла таксама туды працаваць, то пэўны час перажывала, каб мяне не ацэньвалі па маміных заслугах. Пасля любімая работа выратоўвала ў самыя розныя перыяды майго жыцця. Мамы не стала ў мінулым снежні, калі ў мяне быў двухдзённы перапынак на здымках «Фактар.by 60+». Там удзельнікі прыехалі з усёй краіны, пад праект пабудавалі цэлы горад, задзейнічаны былі сотні людзей, таму я, нягледзячы ні на што, вярнулася і працягвала працаваць. І гэта маміна навука. А бацька проста любіў мяне насуперак усім існуючым законам педагогікі. Яны адно аднаго ўраўнаважвалі, выхоўваючы мяне. Бацька сёння побач са мной, за што я яму бязмежна ўдзячная. Бывае, тэлефануеш яму, а ён не адказвае. І тады я гатовая ўсе планы перакроіць — толькі б ведаць, што з ім усё ў парадку. Таму, мяркую, у жыцці галоўнае — паспець скарыстацца часам, які нам даецца, каб быць разам.

***— За што вы ўдзячныя, ацэньваючы сённяшні дзень і мінулае?***

— Не хочацца гаварыць, што я была шчаслівай. У сваім жыцці я ўдзячная за кожны новы дзень. Што магу з радасцю думаць пра заўтра, строіць планы. За магчымасць рабіць нешта добрае для дарагіх мне людзей. За тое, што маю каханне і здароўе. Жыць — для мяне сапраўднае шчасце.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Афіша

# ШТО ТРЫМАЕ ТЭАТР У ДОБРЫМ ТОНУСЕ?

## Прэм'еры. А іх у новым сезоне будзе нямала

**У мінулым сезоне адбылася 141 тэатральная прэм'ера па краіне, з іх 63 — патрыятычнай тэматыкі. А новы тэатральны сезон — не толькі нагода парадаваць гледачоў новымі пастаноўкамі, але і самім калектывам ступіць на нязведаную тэрыторыю творчасці. І якраз пра тое, што плануюць прадставіць сваім наведвальнікам сталічныя тэатры, журналістам распавялі іх прадстаўнікі. Папярэдне заінтрыгуем: выбар стане яшчэ больш разнастайным, сустрэчы з любімымі акцёрамі застануцца, але і давядзецца пачакаць усяго гэтага.**

— Сёння мы хвалюемся ўсе — і тэатры, і гледачы, таму што чакаем чагосьці новага і цікавага. Усе ведаюць пра тое, што прыняты Указ № 275 па падтрымцы асобных дзяржаўных арганізацый культуры, які замацаваў пераход на новы механізм фінансавання і тэатраў з 1 студзеня 2024 года. Будзе створана новая сістэма прыярытэтаў, якая б стымулявала тэатр на больш актыўнае зараблянне грошай. З аднаго боку, тое пашырыць творчую, арганізацыйную і эканамічную самастойнасць тэатраў. А з іншага боку, гэта асаблівыя падыходы да фарміравання іх рэпертуару. Таму што менавіта асабістыя сродкі будуць з'яўляцца асновай фінансавай для стварэння новых пастановак і заработнай платы артыстаў, — распавядае **намеснік начальніка прафесійнага мастацтва галоўнага ўпраўлення дзяржспецмерапрыемстваў прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Таццяна ПАРХАМОВІЧ**. — Мы даўно рыхтаваліся да гэтага пераходу. Трэба падтрымліваць тэатральную дзейнасць не толькі фінансава, але і ў іх развіцці і пачатку самадастатковасці.

Што да навінак сезона, якія і дазволяць паказаць сябе творча і прафесійна і, вядома, дадуць магчымасць падтрымаць любімы тэатр рублём, то іх будзе дастаткова, каб публіцы не пазбаўляць сябе сустрэч з любімым мастацтвам.

### «МАСКАРАД» ЦІ «ЎГОДА З Д'ЯБЛАМ» У ГОРКАЎСКІМ

**Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага** будзе чакаць паранейшаму сваю публіку як на ўжо даўно любімыя пастаноўкі, так і на нядаўнія і новыя прэм'еры. Мінулы юбілейны сезон тут быў насычаны і цікавы, паказвалі сябе рознабакова. «Ідыёт», «Opus 40. Беспасажніца», «Фаўст. Угода з д'яблам» і іншыя пастаноўкі гледачам ужо прадставілі, і на іх можна трапіць цяпер, але і працяг творчых пошукаў будзе.

— Без падтрымкі дзяржавай тэатра не будзе, якія б схемы хто ні прыдумляў. Мы нядаўна выйшлі з рэканструкцыі, і калі б не Міністэрства культуры, не кіраўнік дзяржавы, то ніякага новага абсталявання за ўласныя сродкі наш тэатр сабе не змог бы дазволіць. Трэба дзяржаўная падтрымка тэатрам, інакш без яе яны пачнуць павольна зніжаць творчую планку ў пагоні за зараблянне грошай. Чаму? А таму што грошы можна зарабляць рознымі спосабамі. Лёгкім альбо яркім матэрыялам, а можна і матэрыялам глыбокім... — кажа **мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага Сяргей КАВАЛЬЧЫК**. — Мінулы сезон у нас быў яркі, але і ў новым мы не збіраемся спачываць на лаўрах. Адна са ставак на гэты сезон — удалыя дэбюты нашых маладых рэжысёраў Дэвіда Разумава і Марыі Матох, яны стартавалі ў мінулым сезоне з касавымі пастаноўкамі «Сэлфі са склерозам» і «Фаўст. Угода з д'яблам». На апошні, нягледзячы на лета, у нас былі аншлагі. Паверце, паставіць «Фаўста», каб на яго пайшоў глядач, складаней, чым паставіць «Жанатага таксіста», на якога людзі прыйдуць гарантавана. І матэрыялы, выбраныя рэжысёрамі на наступны сезон, уражваюць сваёй глыбінёй і цікавасцю. Дэвід Разумаў узяўся за «Маскарад» Лермантава, а Марыя Матох — за раман «Дробны чорт» Салагуба. Яны працуюць над інсцэніроўкамі, рыхтуюцца да размеркавання і запусцяцца ў найбліжэйшай будучыні. З Алесяй Сарокінай і з Цімурам Каліноўскім цяпер працуем над казкамі Пушкіна «Залатая рыбка» і «Балда». Гэты праект фінансуе Міністэрства культуры Расіі, яны дапамагаюць рускім тэатрам за мяжой. І выйдуць спектаклі па казках Пушкіна ў снежні. А ў красавіку наступнага года ставім «Анфісу» Леаніда Андрэева да 75-годдзя заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Валянціны Ераньковай. І патрыятычную тэматыку мы не абмінулі ўвагай. Да 80-годдзя вызвалення Беларусі запланавалі цікавы дакументальны праект «І няма сіл цябе забыць». Ён заснаваны на сцэнарыях Галіны Злабенка, яго раней мы рабілі ў фармаце дакументальнага фільма. А цяпер я плануюператварыць гэты матэрыял на сучасную трагедыю.

### «НЕБЯСПЕЧНЫЯ СУВЯЗІ» Ў МУЗЫЧНЫМ ТЭАТРЫ

— У нас новы сезон распачаўся прэм'ерным спектаклем «Беражы мяне, каханая» (кампазітар Аляксандр Пантыкін, лібрэта Канстанціна Рубінскага). Наш тэатр мае пастаноўкі розных жанраў і зместу. Задача ёсць — рабіць беларускі рэпертуар. Працуем над гэтым. «Соф'я Гальшанская» ідзе на дзвюх мовах. І ў сувязі з гэтым мне хацелася б сказаць, што наспеў час адкрываць у кансерваторыі музычную рэжысуру, — дзеліцца **мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра Адам МУРЗІЧ**. — Да Новага года рыхтуем пастаноўку «Кот у ботах». Ставіць яе рэжысёр Наталля Барановская і кампазітар Цімур Каліноўскі. Хачу адзначыць адну прэм'еру, якая плануецца ў нас вясной: 19 сакавіка прыязджае мой вучань Глеб Матвейчук і будзе ў нас ставіць «Небяспечныя сувязі».



Спектакль «Ідыёт» НАДТ імя М. Горкага.

### «БЕЗ ВІНЫ ВІНАВАТЫЯ» І «КРАДЗЕЖ АПОЎНАЧЫ»

Тэатр-студыя кінаакцёра распачаў 42-ы тэатральны сезон. Па словах **дырэктара ўстановы Алы СЦЕБАКОВАЙ**, галоўныя тэмы для абмеркавання — гэта пошук магчымасцяў працаваць у новых фінансавых умовах.

— У мінулым сезоне ў нас адбылася прэм'ера казкі «Аліса ў краіне цудаў», — расказвае яна. — У тэатра ўжо ёсць першая частка гісторыі, а цяпер маем і яе працяг. На спектаклях абсалютныя аншлагі. І ў нас гэта не проста казка, а сапраўдная дзіцячая мюзіклы. У планах на гэты год — паставіць п'есу «Радавыя» Аляксея Дударава. Хоць твор напісаны ў 80-я гады, ён актуальны і для нашага часу. Думаю, гэта будзе не проста аповед пра вайну, а больш глыбокая размова пра лёсы людзей таго часу... Для заробку мы будзем аднаўляць некаторыя нашы камедыі, напрыклад, у планах — «Лёгкага жыцця ніхто не абяцаў». Паралельна ідуць рэпетыцыі і ўвод маладых акцёраў у мюзікл «Крадзеж апоўначы». А на наступны год запланавана пастаноўка п'есы Астроўскага «Без віны вінаватыя».

### «ДВОР МАЙГО ДЗЯЦІНСТВА» ЎБАЧЫМ У КУПАЛАЎСКІМ

Акрэсліў планы на новы тэатральны сезон і **генеральны дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Аляксандр ШАСТАКОЎ**, адзначыўшы, што ў перспектыве там гледачам будуць прадстаўлены таксама «Радавыя» па Дудараву, «А досвіткі тут ціхія» Васільева, «Гэта цудоўнае жыццё» Людвігава і іншыя творчыя праекты:

— А што да планаў на новы сезон, то зараз у нас ідзе шчыльная праца над аўтарскім спектаклем «Двор майго дзяцінства» Данііла Філіповіча, нашага рэжысёра. Прэм'ера плануецца ў снежні. На гэты спектакль выдзелены грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы навукі, культуры, адукацыі, аховы здароўя і маладзёжнай палітыкі на 2023 год. Яшчэ ў новым сезоне ў нас плануецца аднавіць шэраг традыцый нашага тэатра. Напрыклад, з моманту стварэння быў спектакль «Пісаравы імяніны» Галубка, і вось мы яго аднаўляем, — распавядае Аляксандр Шастакоў. — Як нацыянальны тэатр мы папулярызуем беларускую мову і культуру, таму адна з нашых задач — здзяйсняць гастролі не толькі па бліжнім замежжы, але і па рэгіёнах Беларусі, каб знаёміць людзей з нашай творчасцю.

### У ТЮГУ — «БЕЛЫЯ НОЧЫ»

І тэатр юнага гледача ў новым сезоне парадуе новымі прэм'ерамі. 15 і 16 кастрычніка нас чакае «Навальніца» паводле Астроўскага ад рэжысёра-пастаноўшчыка Таццяны Самбук. Таксама з нагоды юбілею актрысы Веры Паляковай з 18 кастрычніка пачнецца юбілейны тыдзень, і любімую артыстку можна будзе ўбачыць у пастаноўках «Майстар і Маргарыта», «Княжна Мэры», «Вішнёвы сад» і іншых.

— Наш тэатр часта звяртаецца да школьнай праграмы, таму што наша задача стварыць спектаклі як для зусім маленькіх гледачоў, так і для школьнікаў, моладзі. З усімі хочацца падзяліцца любоўю да тэатра, і рабіць тое так, каб гэтае захапленне не пакінула гледачоў па жыцці, — дзеліцца **рэжысёр ТЮГа Таццяна САМБУК**. — Таму і «Навальніца» будзе не ў звыклым змесце і прачытанні. Нам хочацца, каб аўдыторыя гэтыя творы адчула і адкрыла для сябе пановаму, а пасля разважала над імі. Яшчэ нас чакае прэм'ера — сумесны праект з ГІТІСам. Прыедзе іх выпускніца Эстэр Мітрафан і будзе ставіць спектакль «Белыя ночы» па Дастаеўскаму. Таксама на Новы год нас чакае «Дзядзечка Ау». Рэжысёр пастаноўкі Ганна Казлова. Цікавы перанос савецкага мультфільма ў сцэнічныя рэаліі.

### ВЯЛІКІ ТЭАТР ПРАПАНУЕ «ІЛЮЗІІ КАХАННЯ»...

— У новым сезоне плануем традыцыйна паказаць чатыры прэм'еры. Да канца бягучага года прадставім гледачам дзве прэм'еры — абедзве ў снежні. Ігар Колб рыхтуе балет «Ілюзіі кахання». Гэта музычная кампіляцыя Фрэдэрыка Шапэна, Дзмітрыя Шастаковіча і Леаніда Шырына, які напісаў музычныя звязкі паміж музыкай двух класікаў. І арыгінальнае лібрэта Ігара Колба — разважанні пра тое, чым з'яўляецца наша жыццё, якое мы ўсе бачым па-рознаму, — дзеліцца **начальнік службы маркетынгавых камунікацый Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь Таццяна АЛЯКСАНДРАВА**. — Другі спектакль, які ўбачым у снежні, гэта «Іаланта» — ён быў у нас у рэпертуары, але некалькі сезонаў не ішоў. Пастаноўку рыхтуе Ганна Маторная. І мы чакаем, што гэта таксама будзе зварот да мінулага і пераходу яго ў сучаснасць, бо сюжэт сляпаты і празрэння можна трактаваць у любую эпоху.

Валянцін Елізар'еў прадставіць у сакавіку балетны спектакль «Папялушка». Не абмінуць увагай і творчы юбілей маэстра (з гэтай нагоды 12 спектакляў кастрычніка будуць прысвечаны яму). Гэта яго пастаноўкі як арыгінальныя, такі класічныя, дзе ўбачым не толькі беларускіх артыстаў, але і зорак расійскага балета, венгерскай оперы. І чацвёртая прэм'ера, якую плануюць прадставіць публіцы бліжэй да канца сезона — опера «Набука» Джузэпэ Вердзі. Запрашэнне папрацаваць з трупай Вялікага тэатра прыняў знакаміты італьянскі рэжысёр Джанкарла дэль Манака. У планах тэатра таксама рэалізацыя такіх праектаў, як Мінскі міжнародны калядны форум, Вялікі навагодні баль, Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў і Балетнае лета ў Вялікім тэатры. Поспехам тут карыстаюцца мерапрыемствы ў фармаце дзён адкрытых дзвярэй. І вось 15 кастрычніка тут плануюць правесці тэатральную раніцу ў Вялікім, прымеркаваную да Дня маці і да Дня бацькі. Гастролі на сцэне тэатра таксама будуць працягвацца. У лістападзе тут чакаюць Вялікі тэатр Расіі з пастаноўкамі «Царская нявеста», «Іван Грозны». Самарскі оперны тэатр прыедзе ў Беларусь з пастаноўкамі «Любоў да трох апельсінаў» Пракоф'ева, а Узбекскі тэатр оперы і балета прылятае да нас з операй «Шукальнікі жэмчугу».

### РТБД ЗАПРАШАЕ НА «СЕЗОН СКАРБАЎ»

— Наша аўдыторыя — гэта людзі, якія палюючь на розныя тэатральныя скарбы: тэатральныя праекты, прэм'еры, спецпраекты, сустрэчы з любімымі артыстамі. І гэта штораз для нашага гледача з'яўляецца пажыткам для яго розуму, такая пляцоўка, куды можна прыйсці і зазірнуць у сябе, — дзеліцца **прэс-сакратар РТБД Жанна ГУРЫНА**. — І скарбы тэатра — гэта таксама людзі... З улікам юбілеяў нашых артыстаў Таццяны Мархель, Дзмітрыя Давідовіча, глядач будзе мець яшчэ больш магчымасцяў сустракацца з імі ў душэўнай атмасферы на нашай пляцоўцы. У гэтым сезоне працягнем і існуючыя ў нас праекты, такія, як дзіцячая творчая майстэрня «Гуляем у тэатр». Будзем па-ранейшаму працаваць з такімі рэжысёрамі, як Яўген Карняг, Аляксандр Барodка, Аліна Зміцер. Яўген плануе выпусціць у гэтым сезоне да канца года трэцюю частку з трылогіі, у якую ўваходзяць спектаклі «Шлюб з ветрам», «Пачупкі». Таксама мае поспех у гледача спектакль «Альпійская балада» па Быкаву, гэта наша класіка. Пастаноўка «Карней» па творах Караткевіча — гісторыя пра беларусаў і беларускае. Там шмат сімвалізму і глыбіняў, якія можна гледачу даследаваць бясконца.

**Алена ДРАПКО.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607 |
| **Продавец** | ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29 |
| **Предмет аукциона** | |
| **Лот № 1 – офис (административное помещение)** общей площадью 457,5 кв. м, инв. номер 200/D-193560, по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 22 – 8 | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 1 014 000,00 бел. руб.** | |
| **Лот № 2 – офис (административное помещение)** общей площадью 301,4 кв. м, инв. номер 200/D-193561, по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 22 – 9 | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 698 400,00 бел. руб.** | |
| **Лот № 3 – офис (административное помещение)** общей площадью 544,3 кв. м, инв. номер 200/D-193565, по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 22 – 13 | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 1 182 000,00 бел. руб.** | |

**Условие аукциона по лотам №№ 1–3:** при приобретении предмета аукциона победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона (перечень размещен на сайте организатора торгов www.cpo.by) на сумму:
по лоту № 1 – 2 829,85 бел. руб. с НДС 20 %, по лоту № 2 – 2 459,70 бел. руб. с НДС 20 %, по лоту № 3 – 1 294,42 бел. руб. с НДС 20 %.
**Обременение по лоту № 1:** аренда. Подробная информация у Продавца.
**Обременение по лотам №№ 1–3:** ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество, установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 10 рабочих дней после проведения аукциона.
**Срок оплаты:** не позднее 10 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи. **Передача предмета аукциона:** не позднее 5 рабочих дней после полной оплаты покупателем стоимости предмета аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.
Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода прав на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 24.08.2023

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **13.10.2023** в 14.30 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1607, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **12.10.2023** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1607, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-310-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов по продаже имущества ОАО «ТРЕСТ БЕЛСТРОМРЕМОНТ» в форме открытого аукциона

| № Лота | Наименование предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. (10 %) | Шаг аукциона, бел. руб. (5 %) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Вибратор, инв. 146 | 9,00 | 0,90 | 0,45 |
| 2 | Генератор сварочный EP200X-XC-200АД (только двигатель), инв. 434 | 52,20 | 5,22 | 2,61 |
| 3 | Дрель ударная GSB 19-2 RE (н/раб.), инв. 756 | 6,00 | 0,60 | 0,30 |
| 4 | Компьютер CDL с монитором «Самсунг», клавиатура системник (н/раб.), инв. 708 | 4,98 | 0,50 | 0,25 |
| 5 | Компьютер монитор «Самсунг» 795, инв. 436 | 2,58 | 0,26 | 0,13 |
| 6 | Компьютер, инв. 525 | 3,18 | 0,32 | 0,16 |
| 7 | Нивелир НИ-3 (н/раб.), инв. 419 | 10,80 | 1,08 | 0,54 |
| 8 | Нивелир НИ-3 (н/раб.), инв. 606 | 5,28 | 0,53 | 0,26 |
| 9 | Нивелир (н/раб.), инв. 597 | 5,28 | 0,53 | 0,26 |
| 10 | Нивелир (н/раб.), инв. 60048-а | 5,94 | 0,59 | 0,30 |
| 11 | Перфоратор SDS plus Bosch GBH 2-28 DFV Герм (н/раб.), инв. 753 | 6,00 | 0,60 | 0,30 |
| 12 | Подъемник к-1, инв. 140 | 33,00 | 3,30 | 1,65 |
| 13 | Подъемник к-1, инв. 302 | 33,00 | 3,30 | 1,65 |
| 14 | ПЭВМ «Сильверадо» (мышь, монит. 19, клав.) без сист. комплект, инв. 500 | 2,34 | 0,23 | 0,12 |
| 15 | Смеситель EM1-950K (н/раб.), инв. 629 | 6,60 | 0,66 | 0,33 |
| 16 | Телефакс, инв. 98 | 0,72 | 0,07 | 0,04 |
| 17 | Теодолит 3Т5КП (н/раб.), инв. 794 | 30,60 | 3,06 | 1,53 |
| 18 | Транспортер, инв. 407 | 45,60 | 4,56 | 2,28 |
| 19 | Шлагбаум ASB600, Китай, инв. 760 | 25,20 | 2,52 | 1,26 |
| 20 | Имущество согласно списку № 1: https://docs.google.com/document/d/10hhmUCHJEaF-grL8W6ro54bLs4rESFdz/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 252,49 | 25,25 | 12,62 |
| 21 | Имущество согласно списку № 2: https://docs.google.com/document/d/1TZ6DIdAX3VN93T4FOyH4T1ciBpVu-C0G/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 892,12 | 89,21 | 44,61 |
| 22 | 1. Гигром. психометр (госповерка); 2. Гигрометр (РФ) д/измер. влажн. стр. мат. Testo 606-1; 3. Гигрометр психометрический ВИТ-1(госповерка); 4. Измеритель влажн. матер. | 224,64 | 22,46 | 11,23 |
| 23 | 1. Дорожные плиты, 4 шт.; 2. ЗПБ 16-37п; 3. КЦ 10-6; 4. ПК 24.12.4; 5. ПК 27.12.8; 6. ПТМ72.15.22-8,0 S800-2а (плиты пустотного настила), 2 шт.; 7. ПТМ75.12.22-8,0 S800 3а | 886,08 | 88,61 | 44,30 |
| 24 | Имущество согласно списку № 3: https://docs.google.com/document/d/1pcqR_6xO9IUEAzuaZs2ftBj5O3OOJ2h1/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 402,48 | 40,25 | 20,12 |
| 25 | 1. Дальномер лазерный GLM 80 BOSCH (рулетка эл.); 2. Эл. уровень | 204,36 | 20,44 | 10,22 |
| 26 | 1. Шпилька 12*2000 рез. Штанга, 0,003 т.шт.; 2. Шпилька резьбовая 16*2000, цинк, 0,036 т.шт.; 3. Шпилька резьбовая цинк 6*2000,0,002 т.шт.; 4. Шпилька резьбовая цинк 8*1000,0,002 т.шт. | 208,26 | 20,83 | 10,41 |
| 27 | 1. Домкрат 111-3913010(25тонн); 2. Домкрат 12-3913010 | 882,18 | 88,22 | 44,11 |
| 28 | 1. Каска защ. СОМ3-55, 3 шт.; 2. Каска защитная Б. б/у; 3. Каска-бейсболка каскетка цв. син., 2 шт.; 4. Халат жен. «Гренада»; 5. Кепи-бейсболка | 24,18 | 2,42 | 1,21 |
| 29 | Имущество согласно списку № 4: https://docs.google.com/document/d/14qYa5M3qIYWZZZqThxOXUSnGxrLUvh4B/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 388,75 | 38,88 | 19,44 |
| 30 | 1. Миксер-дрель МД1-11Э (1100 Вт) без насадки «Фиолент»; 2. Шнур каменщика 30 м (госповерка); 3. Штангенциркуль ШЦ-II-250 (0,05) (госповерка); 4. Кельма из нерж. стали 160 мм; 5. Емкость строит. круглая 45 л.; 6. Шлифшкурка на бум. основе (рулон 115 мм*50 м), 22 п. м; 7. Тачка строит. ТС-2; 8. Ножницы по металлу 260 мм прямые; 9. Ножовка для газобетона 630 мм, 34 тверд., 2 шт.; 10. Молоток-кирка 0,7 кг дер. ручка | 241,02 | 24,10 | 12,05 |
| 31 | 1. Перчатки диэлектр. бесшовные, 2 пары; 2. Розетка 1-гнезд. с/заз; 3. BYLECTRICA откр. уст. белая; 4. Розетка на удлинитель 1-гнезд. переносная, каучук.; 5. Розетка силовая PE 5*32A 3P+PE+N с креплением; 6. Удлинитель 3-фазный ПВС 5*4; 7. Удлинитель L=10м; 8. Удлинитель L=20 м, 2 шт.; 9. Удлинитель L=40 м; 10. Удлинитель У10-001 10 м, 3 шт.; 11. Разъем сил. вилк. 3SP1-024 63A; 12. Разъем силовой НТ-025 32А; 13. Разъем силовой НТ-125 32А, 2 шт.; 14. Провод ПВС 3*2,5 (м), 31 м; 14. Провод ПВС 5*4 (м), 42 м; 15. Стартер ST 111 BASIC смол., 24 шт.; 16. Разъем РШ/ВШ-30, 11 шт. | 361,14 | 36,11 | 18,06 |
| 32 | 1. Форма куба 3ФК-100 (госповерка); 2. Форма куба 3ФК-100 (госповерка); 3. Форма куба 3ФК-100 (госповерка) | 234,00 | 23,40 | 11,70 |
| 33 | 1. Стол компьютерный; 2. Стол письменный 2-тумб. зак., 2 шт.; 3. Стол-приставка заказная 1,0, 2 шт.; 4. Шкаф 47*40*217 | 131,82 | 13,18 | 6,59 |
| 34 | 1. Тел сот Nokia x2-02 RM-694; 2. Факс Panasonik KX-FT 982 RU-B | 88,92 | 8,89 | 4,45 |
| 35 | 1. Щит учета (зд. проходной); 2. Щит учета № 1; 3. Щит учета № 2; 4. ЩУРН-3ф передвижной с ДМ; 5. Трансформатор | 189,54 | 18,95 | 9,48 |
| 36 | 1. Эл. чайник «Люкс» 1.7 л; 2. Электрочайник «Атлант»1,8/1,9-220 ЭЧТЗ с д/м; 3. Электрочайник «Атлант» 1,8/1,9-220 ЭЧТЗ с д/м; 4. Электрочайник Polly № 1,7 л с сигнал. рубин (нерабоч.); 5. Электрочайник ЭЧТЗ1,8/1,9-220 01 «Атлант» с д/м н/р; 6. Мешки пылесб. ECO-104 к пылесосам BOSCH PAS, 4 шт.; 7. Замок врезной мод. Ш 025Б; 8. Гладилка швейц. 13*58; 9. Обогреватель электр. масл. 1,5 кВт; 10. Печь СВЧ HORIZONT 17 MW700-1378B, 2 шт. | 233,22 | 23,32 | 11,66 |
| 37 | 1. Стол письмен. с приставкой; 2. Стол прист. заказ. 0,9х0,45; 3. Стол-приставка заказная 0.6 | 166,92 | 16,69 | 8,35 |
| 38 | 1. Электродвигатель АИР 100S4; 2. Электродвигатель ИВ-117-2 | 226,20 | 22,62 | 11,31 |
| 39 | 1. Чайник электрич. POLLY-Люкс; 2. Чайник электрич. POLLY-Люкс ЕК-20; 3. Чайник электрич. POLLY-Люкс ЕК-20; 4. Чайник электрич. ЭЧТЗ 1,8/1,9-220 мод. 01 «Атлант»; 5. СВЧ-печь; 6. Рукосушитель автоматический | 141,18 | 14,12 | 7,06 |
| 40 | Теодолит 3 т 5КП № 36056 | 1092,00 | 109,20 | 54,60 |
| 41 | 1. Струбцина ленточн. для стяжки полов 120*5000, 2 шт.; 2. Съемник проф. 300 мм; 3. Тачка WB5009 R; 4. Тиски для труб № 2 б/у; 5. Толщиномер неотвердевшего слоя Константа ГЗ(ГП); 6. Топор А-0 0,9 кг в сборе 1,2 кг; 7. Топор метал. с дерев. топорищ. 10514; 8. Траверса; 9. Траверса; 10. Набор щупов (госповерка)); 11. Насос электр. профес. погружной; 12. Ножницы по мет. 260 мм; 13. Кувалда 3 кг | 202,02 | 20,20 | 10,10 |
| 42 | 1. Углометр с нониусом (РФ) 4УМ (10') (госповер); 2. Угольник слесар. 160*100 3 кл.; 3. Угольник столярный 1000 мм; 4. Рулетка 3 м (госповерка) | 326,04 | 32,60 | 16,30 |
| 43 | 1. Теодолит 2 т 30П № 09628; 2. Рейка измерительная GR500 TELESKOP-NIV, BOSCH | 517,92 | 51,79 | 25,90 |
| 44 | 1. Сканер Epson Perfection V33 Финляндия; 2. Сот. тел. Nokia 359033044101168; 3. Стул PR ST Pt; 4. Сумка для ноутбука 15,6", 3 шт.; 5. Излучатель эл. инфракр., 2 шт. | 173,16 | 17,32 | 8,66 |
| 45 | 1. Труба в/ст 5005 п/э, 8,24 м; 2. Труба водосточная, 4 шт.; 3. Рукав 111-9-2.0, 40 п. м; 4. Отвод желоба ОЖВ120/О-Пэ-С; 5. Отвод желоба ОЖВ150/ О-Пэ-С, 2 шт.; 6. Манометр МП-50; 7. Манометр МП-63; 8. Клапан обратный; 9. Водомерный узел | 93,96 | 9,40 | 4,70 |
| 46 | 1. Сварочный аппарат JASIC ARC 200; 2. Резак проп. Р1 «Донмет» 142; 3. Резак проп. РС-3П-100 (9/9) «РО-АР»; 4. Регулятор РДСГ 1-0,5 (50 л); 5. Редуктор БКО-50-4м кислород; 6. Щиток защит. лиц. для электросвар., 2 шт.; 7. Маска (щиток) сварщика ННП-У1; 8. Редуктор углекислотный УР-6-6; 9. Подогреватель ПУ-1 (для подогрева углекислоты) | 241,80 | 24,18 | 12,09 |
| 47 | 1. Замок клиновый, 75 шт.; 2. Замок универс. оц., 55 шт.; 3. Кронштейн подмостей, 25 шт. | 842,40 | 84,24 | 42,12 |
| 48 | Имущество согласно списку № 5: https://docs.google.com/document/d/1I3vPdVS8bAXiRVgH6-J50hWNstVovCuy/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 418,55 | 41,85 | 20,93 |
| 49 | Лист проф. гладк. П-1250*L/0,5-ЛКПЦ-Пэ-С-RAL9003, 1,25 м² | 5,85 | 0,59 | 0,29 |
| 50 | 1. Захват для бордюр, 3 шт.; 2. Захват крановый «Гамма», 2 шт. | 383,76 | 38,38 | 19,19 |
| 51 | Жидкотопливный воздухонагреватель МАК 25 | 600,60 | 60,06 | 30,03 |
| 52 | 1. Дрель GBM 10-2 RE (БЗП); 2. Дверной блок ДГФ 2,1х1,0 межкомнатный; 3. Диск 190*2,0*30 мм; 4. Заклепка 4,0*8 ZK алюм/ст, 0,23 т.шт.; 5. Заклепочник 250 мм; 6. Абраз. сетка 115/280 (50 шт.), 2 упак.; 7. Вибронаконечник к ИВ-117 ф51; 8. Бур садовый ф250; 9. Ведро пожарное, 2 шт.; 10. Грунтовка белая «Тайфун мастер» № 100, 10 кг; 11. Лампа паяльная 1,5 л, 2 шт.; 12. Припой ПОС-61 ф3 мм (фас 1 кг), 0,6 кг; 13. Уровень MAAN 1200 мм; 14. Уровень брусковый 1,0 м; 15. Огнетушитель ОП-4(3), 3 шт.; 16. Огнетушитель ОП-5, 2 шт. | 453,26 | 45,33 | 22,66 |
| 53 | Измеритель адгезии АР (решетка) | 327,60 | 32,76 | 16,38 |
| 54 | 1. Кресло «Престиж», 5 шт.; 2. Полка навесная | 212,16 | 21,22 | 10,61 |
| 55 | Печь отопительно-варочная «НОРМАЛЬ-2» антрацит., труб. | 163,80 | 16,38 | 8,19 |
| 56 | Имущество согласно списку № 6: https://docs.google.com/document/d/1NJLLpjwfAkJpMzz_yEL2Kkdh-a_g-Cdd/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 820,81 | 82,08 | 41,04 |

В отношении лотов №№ 1–19 проводятся седьмые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 95 %.** В отношении лотов №№ 20–56 проводятся третьи повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 35 %.** Ранее публикация о проведении аукциона размещалась в газете «Звязда» № 166 (30046) от 29.08.2023, стр. 6

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения открытого аукциона** | **16 октября 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | **С 10.00 02.10.2023 до 16.00 12.10.2023 года** |
| **Местонахождение имущества** | **г. Гродно, ул. Дубко, д. 11** |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту ___, ОАО «ТРЕСТ БЕЛСТРОМРЕМОНТ», проводимых 16.10.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по тел.: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
**Вознаграждение аукциониста – 7 % (семь процентов) от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 5 (пяти) рабочих дней со дня заключения договора.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться по телефону: +375295894134, Ольга Михайловна.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Продавец** | **Открытое акционерное общество «ТРЕСТ БЕЛСТРОМРЕМОНТ» (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», +375 29 304 59 90, 8017 255 29 28)** |
| **Организатор торгов** | **ООО «Фрондера»: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт: orgtorg.by 220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, офис 1127** |

Нішто сабе!

# Пячора з мінулага

## Выявілі блакітную дзірку глыбінёй 274 метры

**Яе знайшлі каля паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа паўвострава Юкатан у Мексіцы. Аб гэтым напісаў партал IFL Science.**



Навукоўцы назвалі дзірку «Там-Ха» (Taam ja'), што ў перакладзе з мовы мая азначае «блакітная вада». Упершыню яе знайшлі ў верасні 2021 года, але даследаванні апублікавалі толькі ў лютым 2023 года.

Плошча паверхні падводнай пячоры складае 13 690 квадратных метраў, глыбіня — 274 метры. Цяпер «Там-Ха» з'яўляецца другой па велічыні глыбокай дзіркай у свеце. На першым месцы — 300-метровая, якая знаходзіцца ў кітайскім Санша-Юнлэ.

Навукоўцы плануюць вывучыць арганізмы, якія насяляюць пячору, а таксама геалогію дзіркі, што, магчыма, дасць інфармацыю аб навакольным асяроддзі тысячы гадоў назад.

Пласты гісторыі

# Рытуальныя каляснiцы

## Іх з запрэжанымі коньмі раскапалі ў Кітаі

**Пры раскопках у правінцыі Ганьсу археолагі выявілі буйную яму, дзе знаходзілася пяць калясніц. Чатыры з іх былі запрэжаны парамі дарослых коней, прынесеных у ахвяру ва ўзросце сямі-дзевяці гадоў.**



Пад гэтымі калясніцамі даследчыкі знайшлі пахаванні сямі чалавек, зробленых у I тысячагоддзі да нашай эры — у самым фінале бронзавага стагоддзя. Пра гэта паведамляецца ў артыкуле, апублікаваным у часопісе Antiquity.

Пад запрэжанымі калясніцамі археолагі выявілі неглыбокія магілы сямі чалавек, якіх пахавалі ў драўляных трунах. Тыпалагічны аналіз выяўленых артэфактаў дазволіў датаваць гэты аб'ект VII—VI стагоддзямі да нашай эры. Радыёвугляроднае датаванне ўказала на сярэдзіну I тысячагоддзя да нашай эры.

Затым палеазаолагі вывучылі астанкі коней. Усе асобіны, пол і ўзрост якіх удалося вызначыць, аказаліся дарослымі самцамі, якія пражылі ад сямі да дзевяці гадоў. На іх зубах і касцях навукоўцы выявілі анамаліі, якія дазволілі заключыць, што ўсе яны выкарыстоўваліся ў якасці цяглавых жывёл. Цалкам магчыма, што знойдзеныя коні з юнага ўзросту рыхтаваліся для каляснічнай язды. А ў самым росквіце сіл іх адабралі для рытуальнага пахавання разам з памерлымі людзьмі.

Вось у чым справа!

# Кобра тут ні пры чым?

## Гісторыкі раскрылі рэальную прычыну смерці Клеапатры

**Крыніцы называюць розныя «прылады» смерці апошняй царыцы эліністычнага Егіпта з македонскай дынастыі Пталемеяў. Клеапатра — адна з самых велічных персон антычнай гісторыі. Вакол яе імя да гэтага часу шмат спрэчак. Пытанні выклікае і смерць кіраўніцы, паколькі адзіная прычына да гэтага часу не ўстаноўлена.**

Некаторыя сцвярджаюць, што яна здзейсніла самагубства, папрасіўшы прынесці ў яе пакоі атрутную змяю, а іншыя перакананыя, што ўсяму віной дзеянне опіуму і аканіту.

Гісторыкі сцвярджаюць, што легендарная царыца наклала на сябе рукі ў 30 годзе да нашай эры ў горадзе Александрыя. Тады ёй было 39 гадоў. У крыніцах можна знайсці інфармацыю аб тым, што прычынай самагубства магло быць паражэнне, нанесенае рымлянамі яе войскам. Згодна з працамі антычных гісторыкаў Плутарха, Страбона і Дыёна



Касія, Клеапатра памерла ад укусу кобры.

Пакоі Клеапатры старанна ахоўвалі, таму ўнесці туды атрутную змяю было вельмі складана. У працах Плутарха сказана, што дапамог ёй у гэтай справе селянін, які з'явіўся да яе дзвярэй з кошыкам. Вартавыя спыталі, што ён нясе. Адкрыўшы кошык і рассунуўшы лісце, ён паказаў гаршчок, поўны саспелых смокваў. Салдаты паглядзелі, якія яны буйныя і прыгожыя, і селянін, усміхнуўшыся, прапанаваў ім пакаштаваць. Тады яны прапусцілі яго, адкінуўшы ўсякія падазрэнні. Аказалася, пад смоквамі была кобра. Кошык з садавінай паставілі ў пакоях царыцы, бо яна сама распарадзілася зрабіць усё так, каб змяя ўкусіла яе ў нечаканы момант. Па іншай версіі кобру трымалі ў закрытай ёмістасці для вады, а Клеапатра яе выманьвала і спецыяльна падставіла руку для ўкусу.

Ёсць версія, што прычынай смерці царыцы стаў не яд змяі, а сумесь з опіуму і раслін балігалоў і аканіт. Да такой высновы прыйшлі нямецкія вучоныя, якія прааналізавалі асаблівасці змяіных укусаў, а таксама архіўныя дакументы таго часу.

Нагадаем, у сеціве паказалі, як насамрэч выглядала царыца Клеапатра. Аказалася, яна не была такім ідэалам прыгажосці, як яе прадстаўляюць у гістарычных фільмах. У кіраўніцы была грубая знешнасць, а вось зачароўвала мужчын яна сваім розумам і харызмай.

Клімат планеты

# Калі лёд сыходзіць з-пад лап...

## Белыя мядзведзі могуць вымерці да 2100 года



**Лёду, на якім яны могуць паляваць, становіцца ўсё менш з-за глабальнага пацяплення. Белыя мядзведзі поўнасцю знікнуць да канца стагоддзя, калі выкіды парніковых газаў будуць адбывацца ў такіх аб'ёмах, як цяпер.**

Як піша Newsweek, сёння гэтыя жывёлы жывуць на тэрыторыі пяці краін паблізу Арктыкі: у ЗША, Канадзе, Расіі, Грэнландыі і Нарвегіі. Але глабальнае пацяпленне прыводзіць да скарачэння колькасці лёду на Паўночным Полюсе. Таму белыя мядзведзі губляюць арэолы свайго пражывання і перабіраюцца на сушу, дзе ім не хапае харчавання.

Белыя мядзведзі здольныя паляваць толькі з паверхні марскога лёду. На кантыненце няма такой ежы, якая магла б даць жывёлам патрэбную колькасць калорый. Але цёплыя тэмпературы скарачаюць перыяды, на працягу якіх мядзведзі могуць паляваць і запасацца тлушчамі.

«Працягласць часу, на працягу якога яны могуць недаядаць, залежыць ад таго, наколькі тоўстымі мядзведзі змогуць стаць за больш кароткія перыяды. Таму ўся справа ў балансе энергіі», — растлумачыў адзін з аўтараў новага даследавання Стывен Амстрап арганізацыі Polar Bears International.

Ён дадаў, што ў 2010 годзе разам з калегамі спрагназаваў страту дзвюх трацін папуляцыі белых мядзведзяў на Зямлі да сярэдзіны стагоддзя. Але, як аказалася, гэтыя прагнозы былі занадта аптымістычныя.

«Мы ведаем, што за некалькі дзесяцігоддзяў глабальныя тэмпературы пераваляць за тыя, з якімі белыя мядзведзі мелі справу за ўсю гісторыю сваёй эвалюцыі. Гэта азначае, што да канца стагоддзя мы можам аказацца ў свеце без белых мядзведзяў», — сказаў Амстрап.

Тэхналогіі будучыні

# Антымікробны эфект

## Палімеры абароняць ежу ад бактэрый і грыбкоў



**Расійскія навукоўцы стварылі новыя прэпараты для апрацоўкі паверхняў, якія дазволяць змагацца з устойлівымі мікробамі. У першую чаргу распрацоўка прызначана для бальніц, дзе часам выяўляюць бактэрыі, якія выклікаюць небяспечныя інфекцыі. Пра гэта паведамляюць «Известия».**

Навукоўцы Федэральнага навуковага цэнтра харчовых сістэм імя В. М. Гарбатава РАН сумесна з супрацоўнікамі хімічнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава распрацавалі новыя саставы для апрацоўкі сцен вытворчых, складскіх і іншых памяшканняў прадпрыемстваў харчовай прамысловасці і бальніц. Калі нанесці прэпарат на паверхні, мікробы гінуць і іх новых супольнасцяў не з'яўляецца.

Прэпараты распрацавалі на аснове адмысловых палімераў з антымікробнымі ўласцівасцямі — яны здольныя знішчаць бактэрыі, якія кантактуюць з імі.

«У рэцэптурах — водарастваральныя палімеры, гэта значыць, у якасці растваральніка выкарыстоўваецца вада, што робіць працэс нанясення працадурай, якая адпавядае ўсім экалагічным патрабаванням», — распавяла «Известиям» намеснік дырэктара Федэральнага навуковага цэнтра харчовых сістэм імя В. М. Гарбатава Анастасія Сямёнава.

Паводле яе слоў, палімеры бяспечныя для людзей і не запальваюцца, нетаксічныя, пасля іх нанясення на сцены і столі памяшканне не трэба праветрываць.

Распрацоўшчыкі падкрэсліваюць, што ў новых саставах няма антыбіётыкаў ці іншых лекаў, да якіх большасць мікраарганізмаў могуць стаць устойлівыя.

Загадчык кафедры высокамалекулярных злучэнняў МДУ імя М. В. Ламаносава Аляксандр Яраславаў звярнуў увагу на прастату нанясення новага рэчыва. Паводле яго слоў, паверхню не трэба чысціць ад водарастваральных соляў, тлушчаў, алеяў, іржы і затым сушыць, як пры выкарыстанні іншых прэпаратаў.

Распрацоўка можа быць запатрабавана на харчовых прадпрыемствах, падзялілася меркаваннем загадчыца кафедры «Прамысловы дызайн, тэхналогія ўпакоўкі і экспертыза» Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчовых вытворчасцяў Ірына Кірш.

Аднак матэрыял патрабуе праверкі па вызначэнні тэрміну дзеяння палімера ў прамысловых умовах, гэта значыць, колькі ён будзе захоўваць антымікробны эфект, падкрэсліла Ірына Кірш.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

## Іван ЦІХАН:

# «Ва ўмовах, калі на нас ціснуць, мы працягваем змагацца за сумленны і справядлівы спорт»

Міжнародны алімпійскі камітэт зноў абяцае найбліжэйшым часам вырашыць пытанне аб допуску беларускіх спартсменаў на Алімпійскія гульні 2024 года і настойвае на тым, што ў алімпійскім руху няма месца дыскрымінацыі спартсменаў па нацыянальнай прыкмеце. Абяцае і настойвае ўжо амаль два гады, ды і «абяцаць не значыць ажаніцца». А тым часам у разгары кваліфікацыйны адбор на Гульні ў Парыжы. Лёгкай атлетыцы, калі можна так сказаць, шанцуе больш чым іншым відам спорту — у іх адбор заканчваецца за месяц да старту Алімпіяды, таму час адаптацыі пакуль ёсць. Беларускія лёгкаатлеты старанна рыхтуюцца і спадзяюцца выступіць на Алімпійскіх гульнях. А федэрацыя лёгкай атлетыкі паралельна з работай па вяртанні сваіх спартсменаў на міжнародныя стадыёны развівае масавы спорт, далучае да спорту насельніцтва і строіць планы на будучыню. Падрабязней — у інтэрв'ю старшыні Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Івана Ціхана.



Фота БелТА.

**«Дзеці ў нас усе таленавітыя, і наша задача — развіць гэтыя таленты, каб яны змаглі рэалізавацца ў жыцці. Гульні краін СНД прайшлі шыкоўна, спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы не выключэнне. Але ў 14-15 гадоў яшчэ рана казаць аб спорце вышэйшых дасягненняў. У дарослым спорце ўсё вельмі проста: мы ведаем сусветны вынік, ведаем вынік нашага спартсмена, можам іх супастаўляць і разумець, на якім узроўні знаходзіцца наш спартсмен. У 14 гадоў, што не старт, то асабісты рэкорд. Амаль 90 працэнтаў членаў нашай каманды на II Гульнях краін СНД устанавілі асабістыя рэкорды».**

***— Іван Рыгоравіч, самая балючая і самая важная тэма — як вырашаецца пытанне з вяртаннем нашых спартсменаў на міжнародную арэну?***

— Пытанне сапраўды балючае. Мы неаднаразова пісалі лісты ў Міжнародную асацыяцыю лёгкаатлетычных федэрацый. Мы сцвярджаем, што не згодны з рашэннем аб нашым адхіленні, заклікаем выконваць прынцыпы алімпізму, найважнейшы з якіх — спорт па-за палітыкай. У адказ чуем, што пытанне вырашаецца. Абяцалі разгледзець яго яшчэ падчас леташняга чэмпіянату свету ў Арэгоне, але тады яго так і не разгледзелі. Цяпер у міжнароднай федэрацыі створана рабочая група, якая, па ідэі, павінна выпрацаваць і прадставіць умовы, патрабаванні, пры выкананні якіх нашых спартсменаў могуць допусціць да спаборніцтваў. Але пакуль ніякай канкрэтыкі няма. Я як спартсмен, як старшыня федэрацыі лічу, што мы павінны размаўляць з калегамі з міжнароднай федэрацыі на роўных, а не выконваць нейкія ўмовы. Правы нашых спартсменаў ушчэмленыя, яны не могуць выступаць на міжнародных стартах, не могуць паўнавартасна рыхтавацца да Алімпійскіх гульняў. А ў той жа час Міжнародны алімпійскі камітэт вітае допуск да алімпійскага руху розных меншасцяў, трансгендараў і гэтак далей. І наш голас аб тым, што мы гэта не падтрымліваем, ніхто не чуе. Ну, калі так, значыць, да Алімпійскіх гульняў трэба допускаць усіх, а не выключаць спартсменаў толькі з-за іх Алімпійскія гульні — гэта вяршыня спартыўнага майстэрства. Але калі кіраўнікі міжнароднага алімпійскага руху іх дыскрэдытуюць, то, мусіць, варта ісці туды, дзе паважаюць і падтрымліваюць алімпійскія прынцыпы. Мы не змяняем сабе і прытрымліваемся алімпійскіх каштоўнасцяў, але, на жаль, спорт ужо даўно частка палітыкі і шматлікія з гэтых каштоўнасцяў проста сцёртыя.

***— На ваш погляд, ці прымальнай умовай будзе выступленне нашых спартсменаў на міжнародных стартах пад нейтральным сцягам?***

— Асабіста я як спартсмен, які перажыў у спорце шматлікае, пад нейтральным сцягам выступаць не стаў бы. Але Алімпійскія гульні, нягледзячы ні на што, застаюцца галоўным стартам для спартсменаў, і я разумею, што нашы атлеты заўсёды аб іх марылі. І адмовіцца ад мары выступіць на Алімпіядзе для іх можа быць вельмі складана і нават балюча. І, мусіць, мы не маем права забіраць у іх гэту мару. Таму нават ва ўмовах, калі на нас ціснуць, мы працягваем змагацца за сумленны і справядлівы спорт. Я лічу, што Міжнародны алімпійскі камітэт гэтым нейтральным статусам проста забіў сам сябе. Кожная краіна мае права прадстаўляць сваю каманду на Алімпійскіх гульнях, у гонар пераможцы павінен узнімацца сцяг і гучаць гімн яго краіны. Навошта абязлічваць краіны і тым самым разбураць спорт? Падыход з нейтральным статусам — вельмі непрыгожая пазіцыя. Спорт павінен быць з тварам, прыгожым, нацыянальнасці. Я перакананы, што ў алімпійскім руху павінны быць чутныя і заўважныя галасы ўсіх яго ўдзельнікаў. Міністэрствамі спорту Расіі і Беларусі прапрацоўвалася пытанне аб правядзенні ў Расіі гульняў краін БРІКС, куды будуць запрошаны абсалютна ўсе спартсмены. Я думаю, нам трэба падтрымаць гэтую ідэю. Так, яркім. А нейтральны статус його абязлічвае. Людзі, якія сцвярджаюць, што спорт — гэта пляцоўка міру і стварэння, самі ж сеюць варожасць у спорце. МАК страціў свой твар нейтральным статусам. Кіраўнікам сусветнага спорту час бы ад яго адмовіцца і пачаць прымаць адэкватныя рашэнні, накіраваныя на развіццё спорту.

Калі нас дапусцяць у нейтральным статусе, то рашэнне выступаць у такіх умовах ці не — асабісты выбар кожнага спартсмена. Канешне, усе ведаюць, якую краіну прадстаўляе Максім Недасекаў, Таццяна Халадовіч, Ірына Жук і іншыя нашы спартсмены. Калі нас дапусцяць пад нейтральным статусам — мы паедзем выступаць пад нейтральным статусам. І нават у такіх умовах працягнем змагацца за сумленны і справядлівы спорт, у якім ніхто не хаваецца пад нейтральным статусам.

***— Які наогул цяпер настрой у нацыянальнай каманды?***

— Спартсмены трэніруюцца, працуюць. У мінулым годзе мы запусцілі Беларускую лёгкаатлетычную лігу, каб у іх была ўнутраная канкурэнцыя, шчыльны каляндар спаборніцтваў і матэрыяльная падтрымка. Міністэрства спорту і турызму падтрымала спартсменаў. Мы бачылі, што лёгкаатлеты знаходзяцца ў добрай форме — Аляксей Каткавец устанавіў нацыянальны рэкорд у кіданні дзіды, Ілья Карнавухаў стаў рэкардсменам краіны на дыстанцыі 1500 метраў. Таццяна Халадовіч летам 2022 года на Кубку Беларусі паказала найлепшы вынік сезона. Мы запрашаем да ўдзелу ў нашых спаборніцтвах спартсменаў з іншых краін, каб у нашых атлетаў было больш канкурэнцыі.

***— Нягледзячы на ўсе складанасці, спартыўны рэзерв рыхтаваць трэба. Будучыню беларускай лёгкай атлетыкі многія ўбачылі ў жніўні падчас II Гульняў краін СНД. На ваш погляд, якія перспектывы ёсць у гэтых маладых спартсменаў?***

— Дзеці ў нас усе таленавітыя, і наша задача — развіць гэтыя таленты, каб яны змаглі рэалізавацца ў жыцці. Гульні краін СНД прайшлі шыкоўна, спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы не выключэнне. Але ў 14-15 гадоў яшчэ рана казаць аб спорце вышэйшых дасягненняў. У дарослым спорце ўсё вельмі проста: мы ведаем сусветны вынік, ведаем вынік нашага спартсмена, можам іх супастаўляць і разумець, на якім узроўні знаходзіцца наш спартсмен. У 14 гадоў, што не старт, то асабісты рэкорд. Амаль 90 працэнтаў членаў нашай каманды на II Гульнях краін СНД устанавілі асабістыя рэкорды. І калі 15—20 працэнтаў з іх дойдзе да спорту вышэйшых дасягненняў, стануць прафесіяналамі, будзе цудоўна. А той факт, што ў гэтым узросце яны адчулі смак вялікіх спаборніцтваў, павялічыць гэты працэнт яшчэ на 5—10 пазіцый. Хутчэй за ўсё, іх майстэрства раскрыецца да Алімпійскіх гульняў 2032 года. Ім ужо будзе па 22—23 гады, у некаторых лёгкаатлетычных дысцыплінах у гэтым узросце надыходзіць пік формы. І ў тым алімпійскім цыкле ад іх ужо можна чакаць дастойных вынікаў.

***— Ад спорту прафесійнага да масавага. У гэтым годзе Беларуская федэрацыя лёгкай атлетыкі запусціла ўнікальны праект «Бегавая ліга». Калі падвесці прамежкавы вынік праекта, то як вы можаце яго ацаніць? Усё задуманае атрымалася?***

— Па ідэі, такі праект павінен быў з'явіцца ў нас ужо даўно. Задача федэрацыі лёгкай атлетыкі — заразіць (у добрым сэнсе гэтага слова) усю краіну бегам. Па-першае, гэта выдатны спосаб папулярызацыі лёгкай атлетыкі. А па-другое, бег — найлепшы сродак для ўмацавання здароўя. А здароўе — гэта самае галоўнае, што ёсць у чалавека. Таму мы настойваем на той пазіцыі, што ў нашых забегах павінны ўдзельнічаць людзі ўсіх узростаў: ад самага юнага да шаноўнага. Напэўна, вынік гэтай працы мы ацэнім крыху пазней. Але ўжо цяпер, гледзячы на тое, як праходзяць забегі, я разумею, што ў нас усё атрымліваецца. У Жыровічах сабраліся больш за 5 тысяч удзельнікаў, чаму я быў здзіўлены. Вядома, колькасць удзельнікаў у розных гарадах адрозніваецца, але людзі ўдзельнічаюць у забегах і гэта галоўнае. Мы прыкладаем усе намаганні, каб нашы ўдзельнікі заставаліся задаволены. Калі хтосьці едзе па станоўчыя ўражанні — ён іх атрымлівае, той, хто па адмоўныя — ну, кожны знаходзіць тое, што хоча знайсці. «Бегавая ліга» працягваецца. Фінальны забег адбудзецца ў Гродне 11 лістапада. Я асабіста задаволены гэтым праектам, каманда задаволеная. Але галоўную адзнаку нам дадуць удзельнікі забегаў. Мяркуючы па тым, што яны пішуць у водгуках, — таксама задаволеныя. І гэта выдатна, што ўсё больш людзей цікавяцца бегам, таму што гэта самы даступны, самы зразумелы і самы мірны від спартыўнай актыўнасці.

***— Самы вядомы і папулярны забег у краіне — Мінскі паўмарафон, які зусім нядаўна прайшоў у сталіцы дзясяты раз. Якую адзнаку можаце яму даць?***

— Сапраўды, Мінскі паўмарафон — гэта ўжо традыцыя, якой удзяляецца шмат увагі. Цешыць, што сёлета вырасла колькасць удзельнікаў на дыстанцыях 10 і 21 кіламетр. Мы нават не змаглі зарэгістраваць усіх ахвотных. Значыць, узровень бегавой культуры ў краіне вырас. У мінулым годзе мы памянялі трасу забегу, сэрцам Мінскага паўмарафону стаў стадыён «Дынама». А сёлета мы задзейнічалі ўсе магчымасці стадыёна, каб удзельнікам было камфортна. У гэтым годзе Мінскі паўмарафон прайшоў добра, удзельнікі і арганізатары засталіся задаволеныя. Але заўжды ёсць куды імкнуцца. І я ўпэўнены, што наступны паўмарафон будзе яшчэ лепшы.

***— Бегавой лігай і работай па вяртанні спартсменаў на міжнародную арэну дзейнасць федэрацыі лёгкай атлетыкі, напэўна, не абмяжоўваецца. Якія планы ў федэрацыі?***

— У планах, як заўсёды, актыўная дзейнасць. Мы працягваем работу з дзецьмі, праект «300 талентаў для каралевы» пачынае новы сезон. Праект дапамагае нашым дзецям рабіць першыя крокі ў спорце, а дарослым дае магчымасць прагледзець перспектыўных дзяцей 7—10 гадоў. І гэта важна не толькі для лёгкай атлетыкі, але і для іншых відаў спорту. Чым больш шматгранная ў гэтым узросце падрыхтоўка, тым больш магчымасцяў перад дзецьмі адкрываецца ў будучыні. І наша задача — даць ім гэтыя магчымасці. Гэтак жа ў нас ёсць праект «Шкаліяда», дзе мы тэсціруем вучняў школы — гэта ўжо падрыхтоўка спартыўнага рэзерву для спорту вышэйшых дасягненняў.

У вышэйшым звяне ў нас пачынаецца няпростая праца, мы ўваходзім у алімпійскі сезон. Акрамя падрыхтоўкі да галоўных стартаў, гэтым разам давядзецца адстойваць права выступаць на гэтых стартах. Мы будзем працягваць свае праекты для аматараў бегу, каб аб'ядноўваць людзей розных узростаў і прафесій. Федэрацыя лёгкай атлетыкі вядзе актыўную работу з ветэранамі спорту. Два разы за год мы праводзім чэмпіянат па лёгкай атлетыцы сярод ветэранаў, сёлета ў турніры ўдзельнічаюць прадстаўнікі сямі краін. Працы шмат, яна розная, але нацэлена на адно — развіццё лёгкай атлетыкі.

***— Іван Рыгоравіч, у адным з першых інтэрв'ю пасля прызначэння на пасаду старшыні федэрацыі вы адзначалі, што шчаслівыя быць кіраўніком лёгкаатлетычнай сям'і. Цяпер для лёгкай атлетыкі вельмі няпросты час. У вас асабіста шчасця менш не стала?***

— Можа быць, знешне я вельмі спакойны, але ўнутры радуюся кожнаму дню. Так, лёгкая атлетыка — няпросты свет са сваёй спецыфікай, з вялікай колькасцю відаў. Але я задаволены, што жыву ў гэтым няпростым свеце. У лёгкай атлетыцы я амаль 30 гадоў і ўвесь гэты час усю энергію, сілы аддаваў на яе развіццё. Спачатку сваімі выступленнямі, цяпер — на пасадзе старшыні федэрацыі. Я нікому нічога не даказваю і працую не за ордэн ці медаль, а проста раблю тое, што магу, і тое, што павінен. Спорт дапамог мне рэалізавацца ў жыцці як асобе. У жыцці рознае бывае і ўсякае можа памяняцца ў спорце, я ўсё роўна буду ў лёгкай атлетыцы. Я шчаслівы, што жыву, што дапамагаю развівацца любімаму віду спорту, складанаму, няпростаму, але такому цікаваму, і ад гэтага я атрымліваю толькі задавальненне.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ДЗІЦЯЧЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ ПАЧЫНАЮЦЦА З ВУЧОБЫ ДАРОСЛЫХ

Толькі адукаваны трэнер можа падрыхтаваць добрага спартсмена. Таму развіццё трэнераў не менш важна, чым трэніроўка іх вучняў. Са свежымі ведамі і новым досведам новы сезон Дзіцяча-юнацкай баскетбольнай лігі «Слодыч» пачынаюць і трэнеры, якія днямі прайшлі адукацыйны семінар. Такое мерапрыемства Беларуская федэрацыя баскетбола праводзіць другі раз. А ідэя правядзення падобных семінараў належыць знакамітаму трэнеру Яўгену Гомельскаму, які сцвярджае, што рэзерв нацыянальных каманд рыхтуюць дзіцячыя трэнеры. Лагічная выснова — адукаваныя дзіцячыя трэнеры — залог моцных нацыянальных зборных.

«Ад новага сезона дзіцяча-юнацкай баскетбольнай лігі мы чакаем адкрыцця новых зорачак. А для гэтага вельмі важная праца трэнераў, бо тое, што закладзе дзіцячы трэнер, атрымае трэнер нацыянальных зборных. Вельмі хочацца, каб такія семінары сталі штогадовымі, бо лекцыі не паўтараюцца, штогод мы знаходзім нешта новае і цікавае, шчыльна працуем з Вышэйшай школай трэнераў. Задача трэнераў — не проста навучыць дзіця гуляць у баскетбол, а выхаваць яго патрыётам сваёй краіны, навучыць правільна прадстаўляць сябе ў сацыяльных сетках, выбудаваць з дзіцем даверныя адносіны — гэта і многае іншае павінен умець трэнер, які ідзе ў нагу з часам і хоча развівацца. Таму мы на семінары і стараемся закласці гэтыя навыкі ў трэнераў. У нас цяпер няпросты перыяд у спорце, і задача — каб нашы каманды былі канкурэнтаздольныя, а без дзіцячых трэнераў гэтага дабіцца немагчыма», — адзначыла **Настасся МАРЫНІНА, генеральны сакратар — выканаўчы дырэктар Беларускай федэрацыі баскетбола.**

Арганізатары падрыхтавалі для слухачоў насычаную праграму, якая ўключала практычную і тэарэтычную часткі. Трэнерам расказалі, як выбудаваць імідж у сацыяльных сетках. Улічваючы што першае знаёмства трэнера з бацькамі і дзецьмі часцей за ўсё адбываецца менавіта на гэтых пляцоўках, тэма надзвычай важная. Галоўны трэнер мужчынскай нацыянальнай зборнай Расціслаў Вяргун падзяліўся сакрэтамі фарміравання адносін з гульцамі, расказаў пра тонкасці трэнерскай філасофіі. Спецыялісты Вышэйшай школы трэнераў закранулі медыцынскія тэмы, якімі павінны валодаць трэнеры, абмеркавалі тонкасці планавання трэніровачнага працэсу. Не абышлося і без практычнай часткі, прысвечанай тактычным пытанням баскетбола.


Фота Беларускай федэрацыі баскетбола.

«На семінары было ўзнята шмат важных тэм, асабліва было цікава на практычных занятках па агульнафізічнай падрыхтоўцы, таму што ў нашай працы гэта будуць заўсёды актуальныя веды. Навучацца было няпроста з-за інтэнсіўнасці заняткаў, але кожны ўзяў з гэтага тое, што было сапраўды неабходна. Пазнавальнай аказалася лекцыя, прысвечаная планаванню трэніровачнага працэсу, — усё ж такі для нас гэта асабліва важная і патрэбная тэма. Яшчэ адзін вялікі плюс гэтага семінара — магчымасць пагутарыць з калегамі з іншых гарадоў, абмяняцца меркаваннямі і вопытам. Спадзяюся, у наступным годзе нас чакае яшчэ больш цікавых лектараў, а таксама розных навін», — падкрэсліла **трэнер БК «Мінск-2006» Таццяна ЦЫРУЛЁВА.**

**Галоўны трэнер нацыянальных каманд па баскетболе Анатоль ЯКУБЕНКА** заўважыў, што самае галоўнае, каб гэтыя веды пайшлі на карысць. «Так, усё можна паглядзець у інтэрнэце, але там не атрымаеш парады ад калегі, можна абмяняцца меркаваннямі і тым самым адкрыць для сябе нешта новае. Самае галоўнае, каб трэнеры зразумелі, што гэта для іх развіцця важна», — адзначыў ён.

Вучыцца і трэніравацца баскетбольным настаўнікам вельмі важна і таму, што каляндар у юных баскетбалістаў вельмі насычаны. Старт новага сезона Дзіцяча-юнацкай баскетбольнай лігі «Слодыч» супадае з працягам іншых рэгулярных дзіцяча-юнацкіх спаборніцтваў. Але, як паказвае вопыт, усё можна сумяшчаць. Гэта даказалі і трэнеры, чые каманды перамаглі ў мінулым сезоне. Для матывацыі і для прыкладу калегам у пачатку семінара іх узнагародзілі каштоўнымі прызамі. Дарэчы, у 2022/2023 гадах дзіцячыя трэнеры — мэтавая аўдыторыя праекта «Крок у будучыню», які рэалізоўваецца Беларускай федэрацыяй баскетбола пры падтрымцы ФІБА Еўропа. Мэта праекта «Крок у будучыню» — павышэнне кваліфікацыі трэнерскіх кадраў па баскетболе, выкладчыкаў фізічнай культуры і навучэнцаў кафедры спартыўных гульняў БДУФК. Так, на адным семінары крок у будучыню зрабілі не толькі 130 трэнераў, але і ўвесь беларускі баскетбол.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# СПОРТ БУДУЧАГА ДАПАМАГАЕ СПОРТУ СУЧАСНАМУ

## Што такое фіджытал, які пачынае праяўляцца ў Беларусі?

У красавіку, падчас пасяджэння калегій Міністэрстваў спорту Беларусі і Расіі, Алег Матыцын, міністр спорту Расіі, запрасіў беларусаў да ўдзелу ва ўнікальнай спартыўнай падзеі — «Гульнях будучыні». Мерапрыемства пройдзе з 23 лютага да 3 сакавіка 2024 года ў Казані. Упершыню ў спартыўнай гісторыі аб'яднаюцца лічбавы і рэальны спорт. Як адзначаў Алег Матыцын, удзел беларусаў у «Гульнях будучыні» стане яшчэ адным важным крокам у спартыўнай інтэграцыі двух дзяржаў. Адмовіцца ад такой прапановы беларускі бок, вядома, не можа. Таму ў верасні ў Мінску прайшоў першы этап адбору на «Гульні будучыні».

Прынамсі, гэта не проста адбор на буйны турнір, а старт новага спартыўнага напрамку. Праект «Спорт будучыні» аб'яднаў падлеткаў, якія добра арыентуюцца на віртуальных прасторах і пры гэтым займаюцца адзінаборствамі. Арганізатарамі праекта сталі Прэзідэнцкі спартыўны клуб, Беларуская асацыяцыя камп'ютарнага спорту і Беларуская федэрацыя панкратыёна і змешаных баявых адзінаборстваў. У турніры прынялі ўдзел восем каманд — дзве каманды ад Мінскай вобласці і па адной камандзе ад іншых рэгіёнаў. Спаборніцтвы праходзілі ў два этапы. Спачатку ўдзельнікі вызначылі, хто наймацнейшы ў віртуальных паядынках, а дакладней у камп'ютарнай гульні Mortal Kombat.



Другі этап рэальны — па праграме змешанага баявога адзінаборства панкратыён. Пераможцу абіралі па суме балаў.

У камандным заліку перамагла зборная рэгіёнаў, прадстаўнікі якой набралі 50 балаў. На другім месцы — зборная Мінскай вобласці (48 балаў), на трэцім — зборная Пінска (44 балы). У індывідуальным заліку ў вагавой катэгорыі да 42 кг найлепшым стаў Ягор Лаханскі (каманда Мінскай вобласці — 2). Пераможца ў катэгорыі да 46 кг — Цімафей Лістраценка (зборная Пінска). У вагавой катэгорыі да 50 кг найлепш сябе праявіў Іван Міхалоўскі (зборная Ашмян). Арганізатары назвалі найлепшых спартсменаў і ў асобных намінацыях. Найлепшы накаўт паказаў Тамерлан Тургамбаеў, найлепшы сабмішэн у Івана Міхалоўскага. Найлепшым дыджытал-гульцом прызнаны Уладзіслаў Мамалыга, а найлепшым байцом — Цімафей Лістраценка.

«Прэзідэнцкі спартыўны клуб заўсёды ўдзяляе ўвагу тым відам спорту, якімі цікавіцца падрастаючае пакаленне. Таксама мы сочым за сусветнымі тэндэнцыямі. Мы разумеем, што рана ці позна новыя віды спорту ўварвуцца на сусветныя форумы. Таму важна рухацца наперад і апярэджваць час. Вядома ж, камп'ютарныя гульні занялі сваю нішу і з гэтым трэба пагаджацца. Але разам з тым мы павінны дапамагчы класічнаму спорту для таго, каб падтрымаць здаровы лад жыцця, дапамагаць трэнерам і бацькам матываваць дзяцей на такія захапленні. А як гэта зрабіць, калі не прапанаваць тое, што ім цікава?» — падкрэсліў **Павел ЯГОРАЎ, прадстаўнік Прэзідэнцкага спартыўнага клуба.**

У свеце спорту ўжо з'явіўся напрамак, які спалучае ўсё, што падабаецца сучасным дзецям, ну і не толькі дзецям. Знаёмцеся — фіджытал-спорт. Менавіта так называецца інтэграцыя рэальнага і віртуальнага спорту. Фіджытал-спорт па праве можна лічыць самым маладым відам спорту. У Расіі яго афіцыйнае прызнанне адбылося 31 студзеня 2023 года. У нашай краіне ён пакуль толькі пачынае праяўляцца. Узнікненне гэтага спартыўнага напрамку не што іншае, як даніна часу: увесь свет сёння практычна жыве ў лічбавай рэальнасці, што ўплывае і на эканоміку, і на грамадства. Спорт як найважнейшы элемент сацыяльнай сферы не можа заставацца ўбаку ад усеагульнай камп'ютарызацыі і лічбавізацыі. І разам з тым спорт, які не адно стагоддзе дорыць гледачам эмоцыі менавіта ад жывых спаборніцтваў, не губляе сваіх традыцый. Таму фіджытал-спорт спалучае ў сабе класічныя і новыя з'явы ў спорце. Гэта прыцягвае да спорту яшчэ больш увагі, цяпер ім цікавяцца і тыя, хто прывык назіраць за рэальным супрацьстаяннем спартсменаў і тыя, хто аддае перавагу віртуальнай рэальнасці. Фіджытал-спорт адкрывае новыя спосабы самарэалізацыі моладзі. Любая новая форма відовішчаў і спаборніцтваў прыцягвае ўвагу людзей, асабліва маладых.

«Калі мы кажам пра фіджытал-спорт, сумесі лічбавых тэхналогій і рэальнага жыцця, мы кажам не толькі пра спорт. Але і пра вялікую частку нашага жыцця. Кожны з нас не ўяўляе сваё жыццё без смартфонаў. Таму спалучэнне спорту і лічбавых тэхналогій — цалкам лагічны крок», — заўважыў **Антон БЛАДЗІК, намеснік старшыні Беларускай асацыяцыі камп'ютарнага спорту, намеснік генеральнага дырэктара па лічбавых платформах і кантэнце кампаніі А1.**

